Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

16 КРАСАВІКА 2016 г. СУБОТА № 71 (28181) Кошт 2400 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

У яго і мядзведзі танцуюць

СТАР. 12

Спадніцы для мужчын?

СТАР. 15

З гімнастыкай — па жыцці

СТАР. 20

ЖУРАЎЛІНАЯ ВЕРНАСЦЬ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У фермера Уладзіміра ЖАБЁНКА зямельныя надзелы знаходзяцца паміж балотамі, у якіх кожны год селяцца шэрыя жураўлі. З ранняй вясны і да восені птушкі сваімі журботнымі галасамі напаўняюць гукамі наваколле. Праца фермера праходзіць пад сапраўдны жураўліны канцэрт. Знясіленым далёкай дарогай птушкам на прамерзлым балоце не хапае корму. І тады яны спяшаюцца на суседняе поле, бо там можна пажывіцца леташнімі зерняткамі і перапрэлымі кукурузнымі катахамі.

Праз магчымасць наталіць голад палахлівыя птушкі «забываюцца» на свой страх і, убачыўшы постаць чалавека, не спяшаюцца адлятаць. Іх не надта турбуе і шум трактарнага рухавіка. Да восеньскіх халадоў птушкі і чалавек будуць існаваць побач, не перашкаджаючы адно аднаму, а тое і дапамагаючы: фермер будзе частаваць іх зернем і цешыць вока птушынай прыгажосцю, грацыёзнасцю і даскаталасцю.

СТАР. 7

ЦЫТАТА ДНЯ

Міхаіл РУСЫ, намеснік прэм'ер-міністра:

«Аграпрамысловы комплекс Беларусі гатовы да ўступлення краіны ў Сусветную гандлёвую арганізацыю. Такая работа вялася яшчэ пры ўступленні краіны ў Еўразійскі эканамічны саюз, мы ўжо тады пралічвалі ўсё па прынцыпах працы ў СГА. Вядома, пры ўступленні ў арганізацыю трэба адстойваць інтарэсы не толькі нашага АПК, але і ўсёй краіны. Нават у самой Сусветнай гандлёвай арганізацыі не ўсё адназначна і не ўсе гуляюць па адных правілах. Мы ні ў якай меры не павінны быць ушчэмлены або пагоршыць умовы, якія маем цяпер».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 16.04.2016 г.

Долар ЗША	19907,00	▼
Еўра	22416,00	▼
Рас. руб.	301,60	▲
Укр. грыўня	782,97	▲

ISSN 1990 - 763X

9 771990 763008 16071 >

Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Кірава, 23. Тэлефоны: 284-77-77, 284-77-78, 284-77-79. Факс: 284-77-80. E-mail: zvezda@zvezda.by. Рэдактар Ірына Мікалаеўна Шаўчэнка. Рэдакцыйная калегія: Ірына Мікалаеўна Шаўчэнка, Ірына Аляксандраўна Ліпніцкая, Ірына Аляксандраўна Ліпніцкая, Ірына Аляксандраўна Ліпніцкая

ЭКАНОМІКА — ФУНДАМЕНТ АДНОСІН

Беларусь мае намер пашырыць пастаўкі тавараў з высокай дабаўленай вартасцю ў Іванаўскую вобласць

На гэтым Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка акцэнтаваў увагу 15 красавіка падчас сустрэчы з губернатарам Іванаўскай вобласці Расіі Паўлам Каньковым, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

«Я вельмі рады, што вы наведваеце Беларусь, і хачу, каб бліжэй азнаёміліся з нашай краінай», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка расцаніў візіт дэлегацыі Іванаўскай вобласці як вельмі своечасовы. Пры гэтым ён са шкадаваннем канстатаваў, што ў мінулым годзе тавараабарот паміж Беларуссю і Іванаўскай вобласцю скараціўся прыкладна на 20 працэнтаў. Аднак ужо ў пачатку гэтага года ўдалося навярстаць упушчанае. «Мы аднавілі страчаныя пазіцыі, нарасціўшы двухбаковы тавараабарот, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Гэта добрая тэндэнцыя, якую трэба захаваць».

Кіраўнік дзяржавы растлумачыў, што ўдзяляе такую пільную ўвагу нарошчванню ўзаемнага тавараабароту, паколькі гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва з'яўляецца фундаментам любых адносін. Ён дадаў: «У нас няма ніякіх праблем па іншых пытаннях. Мы адзін народ, таму якія тут могуць быць насцярожанасці або разыходжанні?! Нашы поспехі — гэта вашы поспехі, вашы поспехі — гэта нашы поспехі».

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што ў цяперашняй няпростай эканамічнай сітуацыі ў свеце любой дзяржаве вельмі важна як пашыраць сваю прысутнасць на традыцыйных рынках збыту прадукцыі, так і дыверсіфікаваць рынкі збыту. У сувязі з гэтым кіраўнік дзяржавы, у прыватнасці, закрануў некаторыя вынікі свайго ўдзелу ў саміце Арганізацыі ісламскага супрацоўніцтва ў Стамбуле, падчас якога адбыўся шэраг двухбаковых перагавораў з лідарамі замежных дзяржаў. «Мэта мая была абсалютна зразумела. Менавіта на сустрэчы такога ўзроўню ёсць магчымасць сустрэцца з шэрагам кіраўнікоў іншых краін і абмеркаваць дарожныя карты перспектыўнага супрацоўніцтва, а таксама пагаварыць, як выконваюцца двухбаковыя дамоўленасці, напрыклад, з Пакістанам», — адзначыў беларускі лідар. Акрамя таго, падчас перагавораў у Стамбуле размова ішла аб магчымасці ўдзелу Беларусі ў мірным эканамічным развіцці Лівіі, Афганістана. Абмяркоўваліся пытанні пашырэння гандлёва-эканамічнага ўзаемадзеяння з Інданезіяй.

Што датычыцца актывізацыі гандлёва-эканамічных кантактаў з Іванаўскай вобласцю, то Беларусь праяўляе інтарэс да наладжвання вытворчай кааперацыі, у тым ліку ў традыцыйнай для двухбаковага супрацоўніцтва тэкстыльнай прамысловасці, ільнаводстве. Прэзідэнт выказаў упэўненасць, што эканомікі Беларусі і Іванаўскай вобласці шмат у чым падобныя, і яны цалкам могуць узаемадапаўняць адна адну.

Аляксандр Лукашэнка лічыць важным падтрымліваць цесныя кантакты з партнёрамі з Іванаўскай вобласці для ўзаемадзеяння ў такіх сферах, як сельская гаспадарка, будаўніцтва, прамысловасць. «У нас адкрытая эканоміка. У краіне вырабляецца прадукцыя, больш за палавіну якой рэалізуецца на экспарт. Мы гатовы пашырыць наменклатуру вытворчасці і шукаем рынкі збыту. Мы маем намер больш цесна супрацоўнічаць з Іванаўскай вобласцю, хацелася б, каб наша супрацоўніцтва прыводзіла да вытворчасці тавараў з высокай дабаўленай вартасцю», — падкрэсліў ён.

Кіраўнік дзяржавы прапанаваў расійскім гасцям бліжэй азнаёміцца з беларускімі прадпрыемствамі, каб убачыць, наколькі шырокі спектр вырабляемай у краіне прадукцыі. Ён запэўніў, што ўсе дамоўленасці, дасягнутыя ў ходзе візіту расійскай дэлегацыі, будуць рэалізаваны. «Усё, аб чым мы дамовімся, будзе зроблена ў тэрмін», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

У сваю чаргу Павел Канькоў падкрэсліў важнасць таго, што Аляксандр Лукашэнка пастаянна ўдзяляе вялікую ўвагу развіццю кантактаў з расійскімі рэгіёнамі. Ён згадзіўся з тым, што пашырэнне гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва з'яўляецца ўзаемавыгадным. Губернатар канстатаваў, што заўсёды лёгка знаходзіць агульную мову з кіраўнікамі беларускіх прадпрыемстваў.

■ Афіцыйна

ГАНДЛЮ — АСАБЛІВУЮ ЎВАГУ

Прэм'ер сустрэўся з губернатарам Іванаўскай вобласці

«Прамыя сувязі з суб'ектамі Расійскай Федэрацыі з'яўляюцца асновай гандлёва-эканамічных адносін паміж Беларуссю і Расійскай Федэрацыяй. Гэта фундамент нашых стасункаў», — заявіў Андрэй КАБЯКОЎ, прэм'ер-міністр нашай краіны, падчас сустрэчы з губернатарам Іванаўскай вобласці Паўлам КАНЬКОВЫМ.

«У сённяшніх няпростых эканамічных умовах аб'ём нашага ўзаемнага тавараабароту не такі вялікі — крыху меней за 100 мільёнаў долараў. Але мы разлічваем, што здолеем адшукаць магчымасці, каб яго павялічыць. Тым болей што дынаміка гэтага года падказвае, што можна спадзявацца на станоўчыя вынікі», — кажа кіраўнік беларускага кабінета міністраў. Ён таксама прапанаваў павялічваць аб'ём гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва, не забываючы, што беларусы і расіяне — брацкія народы, якія маюць глыбокія культурныя, роднасныя, чалавечыя сувязі, і таму варта сумесна працаваць і ў гэтым рэчышчы.

На думку старшыні ўрада нашай краіны, сярод кірункаў эканамічнага супрацоўніцтва асаблівую ўвагу варта надаваць развіццю гандлю. «Мы можам прапанаваць практычна ўвесь спектр прадукцыі машынабудавання: сельскагаспадарчая, камунальная, пасажырская, дарожна-будаўнічая і кар'ерная тэхніка. А таксама абсталяванне для апрацоўкі харчовых прадуктаў», — прапанаваў Андрэй Уладзіміравіч.

— Мы памятаем Іванаўскую вобласць як цэнтр развіцця менавіта лёгкай прамысловасці савецкай дзяржавы, з вялікімі традыцыямі ў гэтай сферы. І наш «Беллегпрам» зацікаўлены ў развіцці супрацоўніцтва з калегамі, — падкрэсліў прэм'ер. — Нам яшчэ трэба прайсці шлях, калі тавары лёгкай прамысловасці будуць перш за ўсё таварамі айчыннай вытворчасці і будуць знаходзіць свайго спажыўца.

Андрэй Кабякоў таксама прапанаваў і надалей супрацоўнічаць у сферах нафтахіміі, будаўніцтве, сельскай гаспадаркі, і запрасіў узяць удзел у выставе «Белагра», якая адбудзецца ўжо ў чэрвені. «Нам добра вядома пра вашыя планы — маштабную праграму развіцця сельскай гаспадаркі і рэгулявання рынку сельгаспрадукцыі Іванаўскай вобласці. Мы разлічваем, што наша трактарная, кармазборачная тэхніка паслужыць для яе рэалізацыі. Мы гатовы да ўдзелу на любых конкурсных умовах», — сказаў прэм'ер-міністр. І дадаў, што не менш значным для бакоў будзе развіццё прамысловай кааперацыі. Тым больш што ўжо існуе адпаведны праект-аналаг — краны «Іванавец» на шасі МАЗа.

У сваю чаргу Павел Канькоў, губернатар Іванаўскай вобласці, адзначыў, што агульныя для нашых народаў генетычныя карані павінны дазволіць лёгка дамаўляцца па шматлікіх пытаннях. «Таму што няма для Расіі краіны, бліжэйшай за Беларусь па ўсіх параметрах. Цалкам з вамі згодзен, што трэба напаўняць гэтае супрацоўніцтва і ў эканамічнай сферы», — падсумаваў ён.

Вераніка ПУСТАВІТ. *pustavit@zviazda.by*

■ Па палічках

ВЫКЛЮЧЭННЯЎ НЕ БУДЗЕ

Тлумачым падрабязнасці новага пенсійнага заканадаўства

Згодна з указам Прэзідэнта аб удасканаленні пенсійнага забеспячэння, ужо з 2023 года ўсе жанчыны і мужчыны будуць выходзіць на заслужаны адпачынак у 58 і 63 гады адпаведна. Да гэтага часу павышэнне пенсійнага ўзросту будзе ісці паступова — па шэсць месяцаў у год. Асноўныя правілы гульні зразумелыя, але і ў пенсіянераў, і ў работнікаў застаецца яшчэ шмат пытанняў. Разам з экспертамі разбіраемся ў нюансах новага заканадаўства.

Каго гэта закране?

Усіх, хто не паспеў выйсці на пенсію да 2017 года. Выключэнняў не будзе.

— Калі зрабіць выключэнне і захаваць папярэдні ўзрост для якой-небудзь групы, то заўсёды з'явяцца новыя катэгорыі прэтэндэнтаў на льготу, паколькі розніца ў даце нараджэння ў адзін дзень будзе пазбаўляць іх права на пенсію па ранейшых правілах, — патлумачыў **намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Валерый КАВАЛЬКОЎ** падчас анлайн-канферэнцыі на сайтах БЕЛТА і Мінпрацы і сацабароны.

Разам з тым павелічэнне пенсійнага ўзросту не будзе тычыцца грамадзян, якім ужо прызначана пенсія. Для іх налічэнне выплат па ўзросце, няхай яны яшчэ і не дасягнулі новага пенсійнага парога, будзе працягнута.

Што ў пераходны перыяд?

У гэты час дата выхаду на адпачынак па ўзросце будзе залежаць не толькі ад года, але і ад месяца нараджэння. Так, жанчыны, які нарадзіліся з 1 студзеня па 30 чэрвеня 1962 года, і мужчыны, што нарадзіліся з 1 студзеня па 30 чэрвеня 1957-га, змогуць рэалізаваць сваё права на пенсію з ліпеня па снежань 2017 года. Яны выйдуць на адпачынак у 55 гадоў 6 месяцаў і 60 гадоў 6 месяцаў адпаведна. Іх аднагодкі, чый дзень нараджэння выпадае на другую палову 1962 і 1957 года, пойдуць на пенсію ўжо ў другой палове 2018-га — ва ўзросце 56 і 61 год.

Жанчыны і мужчыны, што з'явіліся на свет у першым паўгоддзі 1963 і 1958 года адпаведна, змогуць прэтэндаваць на пенсію ў другой палове 2019-га — у 56 гадоў 6 месяцаў і 61 год 6 месяцаў. Тыя ж, хто нарадзіўся ў другой палове 1963-га і 1958-га, пойдуць на адпачынак у другім паўгоддзі 2020 года — у 57 і 62 гады.

Жанчыны і мужчыны, чыя дата нараджэння выпадае на першую палову 1964 і 1959 года адпаведна, выйдуць на пенсію ў другім паўгоддзі 2021-га — ва ўзросце 57 гадоў 6 месяцаў і 62 гады 6 месяцаў. А іх аднагодкі з датай нараджэння ў другім паўгоддзі атрымаюць права на заслужаны адпачынак у другой палове 2022 года, калі дасягнуць 58 і 63 гадоў.

Валерый Кавалькоў адзначыў, што пры цяперашняй дэмаграфічнай сітуацыі і чаканых інтэнсіўных тэмпах старэння насельніцтва больш плаўнае павышэнне пенсійнай планкі было немагчымым.

А як у сілавікоў?

Іх пенсійная рэформа таксама закране. Ваеннаслужачым у званні да падпалкоўніка ўключна пенсійны парог павысяць, але не больш чым на тры гады. Такім чынам, гранічны ўзрост знаходжання на вайсковай службе і працы ў ваенізаваных арганізацыях (да іх адносяцца органы ўнутраных спраў, Следчы камітэт, МНС, органы фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржкантролю) паступова вырасце да 48 гадоў.

— Выключэнне складуць толькі вайскоўцы і супрацоўнікі, якія праходзяць службу на пасадах, дзе прадугледжаны спецыяльныя патрабаванні да стану здароўя (напрыклад, лётны састаў, аператыўныя і спецыяльныя падраздзяленні па барацьбе з тэрарызмам). Калі ваенна-ўрачэбная камісія прызнае такіх вайскоўцаў і супрацоўнікаў непрыгоднымі да службы на гэтых пасадах, гранічны ўзрост для іх застанецца ранейшым — 45 гадоў. Катэгорыі пасад, на якіх прад'яўляюцца спецыяльныя патрабаванні да стану здароўя, будуць зацверджаны ўрадам па ўзгадненні з Прэзідэнтам, — адзначыў **намеснік начальніка ўпраўлення дзяржаўнага сакратарыята Савета Бяспекі Алег ТАРАСЕНКА.**

Што з ільготнымі пенсіямі?

Пенсійную планку для льготнікаў паступова падымуць на тры гады. Але 10-гадовая і 5-гадовая розніца ва ўзросце для льготнай і агульнай пенсіі захаваецца. **Начальнік галоўнага ўпраўлення пенсійнага забеспячэння Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Наталля МУРАШКЕВІЧ** заўважае, што не зменіцца таксама і неабходны льготны стаж для прызначэння гэтых выплат.

Так, спецыялісты, занятыя на падземных работах, на месцах з асабліва шкоднымі і цяжкімі ўмовамі працы будуць выходзіць на адпачынак у 48/53 гады. Трактарысткі, машыністкі, даяркі — у 53 гады. Пенсійная планка для кіроўцаў гарадскога пасажырскага транспарту і асобных прыгарадных маршрутаў вырасце да 53 і 58 гадоў для жанчын і мужчын адпаведна. У столькі ж гадоў дазволяць выходзіць на адпачынак удзельнікам экспедыцый і брыгад, занятых на палявых геалагаразведачных, гідралагічных, лесаўпарадкавальных і вышукальных работах.

На пяць гадоў раней за агульнаўстаноўлены ўзрост працягнуць атрымліваць выплаты інваліды з дзяцінства, бацькі, якія выхоўвалі малых з інваліднасцю не менш за восем гадоў у перыяд да іх паўналецця.

Права на датэрміновую пенсію маюць і беспрацоўныя. Калі чалавек стаіць на ўліку ў службе занятасці і яго немагчыма уладкаваць, яму могуць прапанаваць выйсці на адпачынак па ўзросце, але не больш чым за год да дасягнення агульнаўстаноўленага пенсійнага парога.

Пра што яшчэ варта памятаць

З гэтага года паступова — крокам у шэсць месяцаў — павялічваецца мінімальны страхавы стаж, неабходны для атрымання пенсіі. Так, у 2017-м, каб мець права на выплаты па ўзросце, страхавы стаж павінен складаць не менш за 16 гадоў, у 2021-м — не менш за 18. І так да 2025 года, пакуль мінімальны страхавы стаж не вырасце да 20 гадоў.

Важная дата звароту па пенсію. Калі ваш выхад на адпачынак па ўзросце прыпадае на пераходны перыяд рэформы, не зацягвайце з падачай дакументаў. Не паспееце аформіцца ў адведзены тэрмін — давядзецца чакаць дасягнення новай узроставай планкі, каб мець права на выплаты. Заканадаўствам, дарэчы, прадугледжваецца магчымасць падаць дакументы за месяц да наступлення пенсійнага ўзросту.

Узрост для прызначэння даплат да пенсій пажылым не зменіцца. Штомесячная мэтавая даплата для людзей ад 75 да 80 гадоў з сакавіка складае 307,5 тысячы рублёў, для грамадзян, якім 80 гадоў і больш, — 410 тысяч.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.
lubneuskaya@zviazda.by

■ Парламенцкі дзённік

ПОЛЬШЧА СВЯТКУЕ 1050-ГОДДЗЕ ХРЫШЧЭННЯ

Віктар ГУМІНСКІ, намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў, знаходзіцца з візітам у Рэспубліцы Польшча. Як паведамляе прэс-служба ніжняй палаты, мэта наведвання — удзел ва ўрачыстым пасяджэнні Нацыянальнага сходу суседняй дзяржавы ў сувязі са 1050-годдзем хрышчэння Польшчы.

Віктар Гумінскі падчас перамоў са Станіславам Тышкам.

Віктар Гумінскі ўжо сустрэўся з віцэ-маршалкам (віцэ-спікерам) Сейма Польшчы Станіславам Тышкам, сустаршынёй польска-беларускай парламенцкай групы Адамам Андрушкевічам і дэпутатамі Сейма — членамі групы дружбы Сільвестрам Хрушчом і Томашам Жымкоўскім.

«Намеснік Старшыні Палаты прадстаўнікоў падзякаваў кіраўніцтву Сейма і Сената Польшчы за запрашэнне прыняць удзел у мерапрыемствах з нагоды святкавання 1050-годдзя хрышчэння Польшчы, — інфармуе прэс-служба. — Віктар Гумінскі адзначыў гатоўнасць беларускага парламента да развіцця беларуска-польскага міжпарламенцкага дыялогу».

Адбылася таксама кароткая сустрэча віцэ-спікера ніжняй палаты нашага парламента са спікерам Нацыянальнага сходу Венгерскай Рэспублікі Ласла Кёверам, які зараз таксама знаходзіцца з візітам у Варшаве.

Надзея ЮШКЕВІЧ. *yushkevich@zviazda.by*

Фота прадастаўлена прэс-службай Палаты прадстаўнікоў.

■ Акцыя

ДРЭВА КУЛЬТУРЫ

У Міжнародны дзень культуры ў Лошыцкім парку высаджвалі дрэвы. Пры ўдзеле міністра Барыса Святлова

Адрэстаўраваная Лошыцкая сядзіба — цяпер прыдатнае месца для сустрэч, калі ў іх укладваецца культурны змест. А тут яшчэ асаблівы дзень, які адзначаецца ў свеце, ды яшчэ падчас абвешчанага ў Беларусі Года культуры. Чаго варта чакаць ад агульнарэспубліканскай акцыі, патлумачыў міністр культуры Беларусі Барыс СВЯТЛОЎ:

Фота Марыі ВОЙЦІК.

— Мы пайшлі па шляху, калі паняцце «культура» не звужана толькі да паняцця «мастацкая культура». Акцэнтавана ўвага на культуры ў шырокім сэнсе — гэта нейкі высокі ўзор, якога трэба дасягнуць у любой сферы, чым бы чалавек ні займаўся: ці гэта культура яго асабістых паводзін, ці гэта культура вытворчасці, ці тая ж мастацкая культура. Калі мы думалі аб правядзенні Года культуры ў Беларусі, то былі гатовыя выкарыстаць вопыт, назапашаны нашымі калегамі расіянамі, дзе падобная акцыя прайшла раней. Але аказалася, што прасцей пайсці сваім шляхам.

Вынік ад гэтага хацеў бы бачыць такі: калі каляндарны Год культуры падыдзе да заканчэння, каб ніхто не заўважыў, што ён скончыўся. Каб мы працягвалі жыць культурай і ў наступную пяцігодку, і ў дзесяцігодку, і г. д. Таму што культура — гэта лад жыцця. Гэта тое, што немагчыма аддзяліць ад чалавека. Засталося зрабіць так, каб кожны гэта ўсвядоміў.

Установы культуры, адзначыў міністр, сёння таксама зарабляюць грошы. Сярод выдаткаў па галіне культуры за 2015 год, 20 працэнтаў займалі сродкі, зароблены самімі ўстановамі культуры. Дынаміка з года ў год на павелічэнне працэнта ўласных сродкаў сярод тых, што адпушчаны на культуру.

— Мы прынялі новую пяцігадовую праграму «Культура». Яе каштарыс на 5 гадоў складае каля 30-ці трыльёнаў рублёў. 5 трыльёнаў прадугледжвае рэспубліканскі бюджэт, 20 трыльёнаў — з мясцовых бюджэтаў, яшчэ 5 — тыя грошы, якія павінны ўнесці ўстановы за кошт зароблены сродкаў для рэалізацыі названай праграмы.

На погляд Барыса Святлова, важна, каб кожны зразумеў для сябе, што культура — гэта неабходная ўмова існавання яго асабістага, яго сям'і і бліжэйшага атачэння, а таксама ўсёй нашай краіны.

Пасля сустрэчы кожны з прысутных зрабіў унёсак у вырошчванне ліпы ля Лошыцкай сядзібы. «Культывавалі», ці апрацоўвалі, наш культурны асяродак. А крыху далей у той жа ўдзень у самім парку работнікі таксама высаджвалі дрэвы...

Ларыса ЦІМОШЫК.
tsimoshyk@zviazda.by

■ Сяўба-2016

У ШТАТНЫМ РЭЖЫМЕ

Па словах намесніка прэм'ер-міністра Беларусі Міхаіла РУСАГА, пасяўная ў краіне праходзіць у штатным рэжыме. Ён адзначыў, што, паколькі зіма была маласнежная, вільгаці ў глебе сёння недастаткова, таму дажджы, якія пачаліся, паспрыяюць сяўбе. Адначасова з гэтым вырашаюцца пытанні па колькасці ўгнаенняў, якія неабходна ўносіць у цяперашніх умовах.

Таксама па ацэнцы Міхаіла Русага, азімыя цяпер знаходзяцца ў добрым стане. Што тычыцца ранніх яравых культур, то яны пасеяны прыкладна на 67% плошчаў. Гаспадаркі пачалі сеяць лён, цукровыя буракі, кукурузу, бульбу.

Ілья КРЫЖЭВІЧ. *kryzhevich@zviazda.by*

■ Адукацыя

З УХІЛАМ У ПРАФАРЫЕНТАЦЫЮ

Якім павінен быць шосты вучэбны дзень у школе? Чым заняць вучня і што зрабіць, каб яму было цікава і, галоўнае, карысна? Пра гэта і іншае ішла гаворка падчас рэспубліканскага семінара-практыкума, які прайшоў у Магілёве.

Удзельнікі на свае вочы ўбачылі, як арганізавана праца ў шэрагу магілёўскіх школ і каледжаў, устаноў пазашкольнай дзейнасці. Магілёўская вобласць была выбрана невыпадкова. Летась у краіне адбыўся рост дзіцячай і падлеткавай злачыннасці, і толькі ў Магілёўскай вобласці назіраўся спад. Паўплывала і тое, што вобласць дэманструе высокія паказчыкі ў выхаваўчай працы, у тым ліку грамадзянска-патрыятычнага кірунку. Як адзначыў **намеснік міністра адукацыі Віктар ЯКЖЫК**, падчас яго нядаўняга візіту ў Ніжагародскую вобласць расіяне расказалі пра плённае супрацоўніцтва з адным з раёнаў Магілёўскай вобласці ў пошукавай дзейнасці.

— Прыемна, што тут праца школьнага шостага дня арганізавана на такім высокім узроўні, — кажа намеснік міністра. — Усе напрамкі, якія мы рэкамендавалі як базавыя, апрабаваны практычна. Перш за ўсё гэта працоўнае выхаванне, спартыўная накіраванасць, розныя школьныя спаборніцтвы. Мы бачылі, як бацькі разам са сваімі дзецьмі наведваюць школьныя мерапрыемствы. Тыя ўстановы, дзе мы пабывалі, сапраўдныя сацыякультурныя цэнтры. Гэта тое, чаго можна і трэба дасягнуць праз планавую і сістэмную работу школьнага шостага дня.

Падчас семінара шмат увагі надавалася прафарыентацыйнай дзейнасці.

— У наступным вучэбным годзе гэты напрамак будзе адным з асноўных, — падкрэсліў намеснік міністра. — На прыкладзе Магілёва мы ўжо сёння бачым, як у 7-8 класах дзеці вызначаюцца з базавай прафесіяй. Трэба знаёміць школьнікаў з сучаснымі рабочымі прафесіямі і з тымі, якія можна атрымаць з дапамогай ВНУ.

На думку Віктара Якжыка, дапамагчы навучэнцам змогуць універсітэцкія суботы накшталт той, якая адбудзецца 14 мая ў Мінску на базе Палаца спорту. Туды будуць запрошаны школьнікі з усіх рэгіёнаў вобласці. У Магілёве гэтая форма ўжо практыкуецца, прычым ёсць не толькі ўніверсітэцкія, але і прафесійныя суботы.

— Яшчэ адна з асаблівасцяў новага навучальнага года — прафарыентацыя з улікам нашага далучэння да руху General skills, — падкрэсліў Віктар Якжык.

Нэлі ЗІГУЛЯ. *zigulya@zviazda.by*

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «1-я Минская птицефабрика» (продавец) проводит открытый аукцион

по продаже яйцесортировальной машины МОВА Omnia XF 125,

расположенной по адресу: Минская область, Минский район, аг. Большевик.

Начальная цена без НДС – 784 700 000 бел. руб. Задаток 10% от начальной цены (78 470 000 бел. руб.)

Задаток перечисляется на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015 государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель).

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **17.05.2016 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **16.05.2016** до **16.00** по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224-61-34, (8029) 102-21-17.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Молодечненский завод металлоизделий» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже имущества в составе:

ЛОТ № 1:

№	Наименование	Инв. №	Общ. пл., кв.м
1	склад металла	630/С-45426	462,7
2	центральная проходная	630/С-45441	46,8
4	здание участка нестандартного оборудования	630/С-74597	228,7
4	здание склада металла	630/С-74596	314,8
5	**Оборудование согласно перечню (64 единицы, перечень находится у организатора аукциона)**		

Указанное недвижимое имущество расположено на земельном участке, площадью **2,4130 га** (предоставлен продавцу на праве общей долевой аренды) с кадастровым номером 642000000002000542 по адресу: Минская область, Молодечненский район, г. Молодечно, ул. Промысловая, 4.

На земельном участке имеются ограничения прав в использовании: охранная зона линий связи и радиофикации (0,0345 га).

Начальная цена с НДС (20%) – 1 806 652 316 бел. руб. Задаток 10% от начальной цены – 180 665 000 бел. руб.

ЛОТ № 2:

№	Наименование	Инв. №	Общ. пл., кв.м
1	помещение гальванического участка (изолированное помещение)	630/D-29945	730,7
2	помещение сборочного участка (изолированное помещение)	630/D-29942	382,4
3	ангар	630/С-45402	1021,5
4	склад металла (в состав входят: склад для металла и навес)	630/С-45412	679,9
5	подстанция	630/С-45414	38,8
6	котельная новая (в состав входят: котельная и склад красок)	630/С-45429	535,1
7	сварочный (токарно-штамповочный) цех (в состав входят: сварочный (токарно-штамповочный) цех, 2 холодные пристройки и сарай)	630/С-45434	947,8
8	ангар (сварочный участок) (в состав входят: ангар (сварочный участок) и холодная пристройка)	630/С-45438	1061,1
9	здание трансформаторной подстанции	630/С-74599	83,8
10	здание склада химии	630/С-74598	67,9
11	Уборная, инв. номер по бух. учету 016		
12	Стеллажная эстакада, инв. номер по бух. учету 018		
13	Ограждение территории, инв. номер по бух. учету 017		
14	Кабельные линии (алюминиевая оболочка), инв. номер по бух. учету 4015		
15	Кабель, инв. номер по бух. учету 4016		
16	Кабель, инв. номер по бух. учету 4017		
17	Кабель, инв. номер по бух. учету 4018		
18	Кабель, инв. номер по бух. учету 4019		
19	Водопровод, инв. номер по бух. учету 4020		
20	Канализация общего назначения, инв. номер по бух. учету 4021		
21	Внутриплощадочные канализационные сети, инв. номер по бух. учету 4023		
22	Внутриплощадочные водопроводные сети, инв. номер по бух. учету 4024		
23	**Оборудование согласно перечню (50 единиц, перечень находится у организатора аукциона)**		

Указанное недвижимое имущество расположено на земельном участке, площадью **2,4130 га** (предоставлен продавцу на праве общей долевой аренды) с кадастровым номером 642000000002000542 по адресу: **Минская область, Молодечненский район, г. Молодечно, ул. Промысловая, 4.**

На земельном участке имеются ограничения прав в использовании: охранная зона линий связи и радиофикации (0,0345 га).

Начальная цена с НДС – 9 793 347 684 бел. руб. Задаток 10% от начальной цены – 979 334 000 бел. руб.

Задатки в размере 10% от начальной цены перечисляются на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, УНП 690324015.

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Торги проводятся в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16 (с изменениями и дополнениями).

Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель). Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **16.05.2016** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **13.05.2016** до **16.00** по указанному адресу.

Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.

Учреждение «Гомельская ЦСДЮШОР профсоюзов «Сож»

ОБЪЯВЛЯЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

по отчуждению здания Центральной гребной базы

площадью 1489,3 кв.м, 1978 года постройки, инвентарный номер 350/С-156880, расположенной на земельном участке площадью 0,2394 га с кадастровым номером 340100000007000144 по адресу: г. Гомель, ул. Перевалочная, 68.

Начальная стоимость составляет 182 869 (сто восемьдесят две тысячи восемьсот шестьдесят девять) долларов США без учета НДС.

Валюта торгов – доллар США, валюта платежа – белорусский рубль. Оплата производится в белорусских рублях с применением официального курса Национального банка Республики Беларусь на день платежа.

Дополнительные сведения: земельный участок: правообладатель (право постоянного пользования) – юридическое лицо, резидент Республики Беларусь учреждение «Гомельская центральная специализированная детско-юношеская школа олимпийского резерва профсоюзов «Сож».

Для участия в аукционе участник предоставляет следующие документы:

- заявление на участие в аукционе;
- копии учредительных документов, свидетельства о государственной регистрации;
- документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим участника банком (при наличии);
- копия платежного документа о внесении задатка (задаток 30 000 000 белорусских рублей), задаток перечисляется **до 20.05.2016 года:**

Учреждение «Гомельская ЦСДЮШОР профсоюзов Сож»
246050, г. Гомель, ул. Советская, д. 29,
р/с 3015640330004 в ОАО «Паритетбанк» г. Минск
МФО 153001782, УНП 490423356.

- юридические лица – нерезиденты Республики Беларусь – помимо вышеперечисленных документов предоставляют легализированные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения, переведенных в установленном порядке на белорусский (русский) язык;
- представители юридических лиц – документ, удостоверяющих личность, а также документы, подтверждающие их полномочия на участие в аукционе и на подписание документов;
- физическое лицо (его представитель, участвующий в аукционе) – документы, удостоверяющие личность, доверенность (в случае представления интересов другого лица);
- иные документы по усмотрению участника.

К участию в аукционе не допускаются лица, не представившие вышеперечисленные документы.

Порядок проведения открытого аукциона, оформление участия в торгах, определение лица, выигравшего торги, осуществляется в соответствии с Положением о порядке проведения открытого аукциона, утвержденного Постановлением Президиума Совета ФПБ от 28.01.2016 года.

Дата проведения аукциона – 24.05.2016 года.

20.05.2016 года – регистрация участников открытого аукциона и прием документов прекращается.

Аукцион состоится по адресу: **г. Гомель, ул. Советская, 29, каб. 103 в 12.00, тел./факс 8 (0232) 71-01-15, тел. 8 (0232) 71-75-18.**

ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

Наименование (описание), местонахождение и стоимость имущества	**ЛОТ №1.** **Автомобиль Мерседес-Бенц Спринтер 311,** **регистрационный номер 8137ЕТ-2, 2014 года выпуска** ***Первоначальная стоимость – 445 866 000 рублей.***
Собственник (владелец) имущества	ООО «СоМеТ», УНП 391427842
Местонахождение (адрес) имущества	г. Орша, ул. Марата, 214
Информация об обременениях	Без обременений
Место (адрес), дата и время проведения торгов	г. Орша, ул. Островского, 36, каб. 9 **16 мая 2016 года в 11.00**
Справочная информация	Отдел принудительного исполнения Оршанского района и г. Орши, 211030, г. Орша, ул. Островского, 36 Главный специалист – Маханькова Анастасия Александровна, тел. 80216543205
Условия и порядок проведения торгов	1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет отдела принудительного исполнения Оршанского района и г. Орши № 3642903000794 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 647, УНП 300002505, **не позднее 11.00 16.05.2016 г.** Минимальная величина первого шага – 5% стоимости каждого лота. В соответствии с ч. 3 ст. 401 ХПК Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги

■ З першых вуснаў

НЕ ТОЛЬКІ ВЫСЛУХАЦЬ, АЛЕ І ПАЧУЦЬ

У гэту нядзелю — 17 красавіка — Фрунзенскаму раёну нашай сталіцы спаўняецца 65 гадоў. Фрунзенскі раён мае свае асаблівасці — сёння гэта самы буйны і населены раён у горадзе Мінску і ў краіне ў цэлым. Менавіта на тэрыторыі гэтага раёна ўводзіцца ў эксплуатацыю больш за 40% гарадскога жылля, а пражывае больш за 458 тысяч чалавек. За апошнія 5 гадоў тут пабудавана 9 дашкольных установаў адукацыі і 3 школы, уведзена ў эксплуатацыю больш за 300 гандлёвых аб'ектаў і буйных шматфункцыянальных цэнтраў з шырокім спектрам паслуг, пабудавана больш за 2 млн квадратных метраў жылля.
На тэрыторыі гэтай адміністрацыйнай адзінкі дзейнічаюць такія буйныя прамысловыя гіганты, як акцыянернае таварыства «МАПІД», Мінскі завод будаўнічых матэрыялаў, таварыства «Табак-інвест» і іншыя. У раёне зарэгістравана каля 17 тысяч індывідуальных прадпрымальнікаў і 8 708 юрыдычных асоб. Гэта сапраўды ўнушальныя і знакавыя лічбы, але... Кіраўніцтва адміністрацыі раёна ўпэўнена, што галоўнай каштоўнасцю гэтай тэрыторыі з'яўляюцца мясцовыя жыхары з іх планамі, радасцямі і праблемамі. Каманда раённай адміністрацыі і была створана якраз дзеля таго, каб у людзей гэтых праблем было менш. Якім чынам такая задача паспяхова выконваецца, карэспандэнту «Звязды» расказаў кіраўнік адміністрацыі Фрунзенскага раёна Мінска Барыс ВАСІЛЬЕЎ.

Фота Надзеі БУЖАН.

— Барыс Анатолевіч, кажуць, што вамі быў знойдзены нейкі асаблівы фармат кантактавання з насельніцтвам. У чым ваш галоўны сакрэт?

— Сакрэтнага рэцэпту ў нас няма, галоўны пасыл — пачуць кожнага чалавека, які звяртаецца ў адміністрацыю па дапамогу.

У гэтай сувязі адзначу выпрацаваны гадамі стыль нашай працы — я і мае падначаленыя ніколі не пройдзем міма чалавека, які наведаўся да нас на прыём нават у незапланаваны час, але ў яго абліччы «чытаецца» жывое пытанне і відаць, што ён не ведае, хто можа вырашыць яго праблему. Мы ўсе са сваёй камандай намеснікаў менавіта ў такім фармаце і працуем.

Увогуле, намеснікі прымаюць людзей па асабістых пытаннях штотыднёва. Гэта робіцца дзеля таго, каб у жыхароў раёна не назапашваліся праблемныя пытанні аператыўнага рэагавання мясцовага ўзроўню. Тут нам дапамагаюць і «прамыя лініі» па суботах, якія былі ўведзены не так даўно. Пасля падобнай практыкі мы адчулі, што на такіх мерапрыемствах існуе рэальная магчымасць своечасова вырашаць любыя актуальныя пытанні нашых жыхароў.

Другі стратэгічны момант нашай працы — выхад чыноўнікаў у народ па месцы жыхарства. Гэта сустрэчы ў працоўных калектывах, у міністрацыях мікрараёнаў, непасрэдна з людзьмі на пляцоўках жыллёвага сектара. У гэтым выпадку выкарыстоўваецца форма зносін з больш шырокім удзелам гарадскіх службаў. Галоўная ідэя такіх мерапрыемстваў

Насупраць згаданага магазіна «Мацярык» будзе пабудаваны ўнікальны комплекс для паспяховага развіцця бізнесу GREENCITY агульнай плошчай 100 640 квадратных метраў, аналагаў якому няма ў нашай краіне.

у тым, каб у кожным мікрараёне любы жыхар Фрунзенскага раёна меў магчымасць задаць пытанне і атрымаць адказ.

— Мне здаецца, што не вельмі глабальныя пытанні грамадзян можна вырашаць і на месцы?

— Так. У раёне існуюць калегіяльныя органы тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання. Створаны працоўныя групы, якія ўзначальваюць кіраўнікі ЖЭСаў. Туды ўваходзяць прадстаўнікі МНС, міліцыі, цэнтра гігіены, супрацоўнікі адміністрацыі і кіраўнікі асобных буйных прадпрыемстваў раёна. Гэтыя групы два разы на месяц збіраюцца і абмяркоўваюць усе актуальныя пытанні мясцовага ўзроўню.

Таксама ў нас дзейнічаюць саветы апорных пунктаў грамадскай бяспекі. Яны вырашаюць выключна праблемныя пытанні і выклікаюць «на размову» тых людзей, якія парушаюць розныя нормы, у тым ліку і правілы ўтрымання жылога фонду, калі не займаюцца выхаваннем дзяцей і г. д.

— Вызначаныя структуры і кантактуюць напрамую з насельніцтвам?

— Сапраўды так. На прыкладзе мікрараёна «Каменная Горка» намі была падлічана колькасць зваротаў ад насельніцтва. Летась мы атрымалі больш як 7,5 тысячы пытанняў, якія былі зададзены людзьмі па самых розных напрамках. Пасля правядзення дакладнага аналізу намі было выяўлена, што каля 98% гэтых пытанняў лёгка вырашаліся на мясцовым узроўні. Выключна на ўзроўні кіраўніка нейкага падраздзялення ці прадстаўніка пэўнай службы.

Такая дакладная інфармацыя дазваляе адміністрацыі паспяхова аналізаваць сітуацыю па балючых кропках і своечасова ўздымаць глабальныя пытанні ўжо на ўзроўні кіраўніцтва менавіта Фрунзенскага раёна. Акрамя таго, раз на месяц у адміністрацыі праводзіцца пашыраная нарада пад маім кіраўніцтвам, дзе прысутнічаюць старшыні гэтых калегіяльных органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання і прадстаўнікі ўсіх зацікаўленых структур і службаў раёна.

— Рэформа ЖКГ пераходзіць са стадыі эксперымента ў больш практычную плоскасць. Ваш раён у гэтым кірунку таксама пачынае суцэльную мадэрнізацыю?

— Пытанне сапраўды складанае. Па гэтым кірунку яшчэ канчаткова не завершаны перыяд рэструктурызацыі. З першых дзён красавіка ў нас толькі пачала працаваць служба заказчыка ў гэтай сферы.

Сёння ідзе структурная перабудова, калі ў сістэме рэалізуецца даволі шмат змен у частцы работ, якія былі перакладзены на насельніцтва. Напрыклад, у гэтую сферу трапіла прыборка і рамонт пад'ездаў і нейкія іншыя работы. Таму сёння стаіць задача знайсці (распрацаваць) прымальную для ўсіх бакоў метадалогію ўзаемаадносін. Аднак ужо цяпер зразумела, што роля насельніцтва будзе павялічвацца і ў ацэнцы такіх работ, і ў ступені ўдзелу па ўтрыманні жыллёвага фонду.

Акрамя таго, такая рэформа першапачаткова была ініцыявана ў першую чаргу дзеля таго, каб істотна палепшыць якасць абслугоўвання жыллёвага фонду. У гэтай сферы ў нас ёсць пэўныя планы, але рэалізацыя іх на практыцы патрабуе некаторага часу.

— У Мінску даволі востра стаіць пытанне транспартных развязак. Пакуль што невялікія заторы раніцай і ўвечары істотна зніжаюць эфектыўнасць дзеяння грамадскага транспарту. У свой час нават дэпутатамі актыўна абмяркоўвалася пытанне аб стварэнні спецыяльных палос для руху аўтобусаў і тралейбусаў. Асабліва гэтая тэма актуальная для перакрыжавання дарог каля станцыі метро «Каменная Горка».

— Ёсць такая праблема. Аднак, толькі стварэннем нейкіх спецыяльных палос яе не вырашыць. Патрэбна комплекснае вырашэнне праблемы. Адміністрацыя раёна займалася пошукам кропак узаемадзеяння з прадстаўнікамі буйнога бізнесу, які размешчаны ў гэтым месцы. І прыватнікі з грашыма пайшлі нам насустрач. Сёння спецыялізаваны гандлёвы цэнтр «Мацярык» выказаў намер за кошт сваіх сродкаў распрацаваць праект і правесці рэканструкцыю ўчастка па вуліцы Лабанка. Акрамя таго, з парковачнай пляцоўкі гэтага цэнтра будзе зроблены дадатковы выезд на вуліцу Прытыцкага. Мы спадзяёмся, што такая рэканструкцыя здыме большасць пытанняў з развязкай гэтага транспартнага вузла. Плануецца, што праведзена яна будзе ўжо сёлета.

— Фрунзенскі раён апошнім часам актыўна развіваецца і будуецца. Якія знакавыя аб'екты тут будуць узведзены ў найбліжэйшы час?

— Насупраць згаданага магазіна «Мацярык» будзе пабудаваны ўнікальны комплекс для паспяховага развіцця бізнесу GREENCITY агульнай плошчай 100 640 квадратных метраў, аналагаў якому няма ў нашай краіне. У складзе гэтага комплексу будзе пабудаваны і самы вялікі ў краіне гіпермаркет з гандлёвай плошчай 13,2 тысячы квадратных метраў. Будаўніцтвам гэтага комплексу займаецца інвестыцыйная кампанія ЕўраСтэпГруп.

Сярод ужо пабудаваных сацыяльных аб'ектаў можна з гонарам адзначыць дзве сучасныя школы з басейнамі. Былі рэканструяваны тэнісныя корты. Усяго за 8 гадоў у Фрунзенскім раёне было пабудавана 3 млн 650 тысяч квадратных метраў жылля, што адпавядае больш чым 40% ад агульнага аб'ёму пабудаванага за гэты час жылля ў сталіцы. Сёлета плануецца ўвесці ў эксплуатацыю дзве паліклінікі — дарослую і дзіцячую.

— Лічыцца, што ваш раён з'яўляецца самым маладзёжным у горадзе, бо тут найбольшая колькасць шматдзетных сем'яў...

— Так. Кожная трэцяя шматдзетная сям'я Мінска жыве ў нас. У раёне функцыянуе 150 установаў адукацыі, сярод якіх ажно 80 дзіцячых садкоў. Сёлета будуецца яшчэ тры садкі.

— З надыходзячым святам вас і дзякуй за гутарку.

Сяргей КУРКАЧ.
kurkach@zviazda.by

■

■ Экскурсія для пабрацімаў

Як у Фрунзенскім раёне сталіцы захоўваюць гістарычную спадчыну і ствараюць будучыню

БІВЕНЬ МАМАНТА І ІНВЕСТПРАЕКТЫ

Гэта самая вялікая адміністрацыйная адзінка сталіцы, па колькасці насельніцтва раён перарос нават некаторыя абласныя цэнтры. Нядаўна ён пашырыўся за кошт новых мікрараёнаў, такімі як Каменная Горка, Дамброўка і былая вёска Сухарава. Нягледзячы на іх «маладосць», сам Фрунзенскі ўжо пакінуў немалы след у гісторыі сталіцы за сваё 65-гадовае існаванне. Прыгожы юбілей раён адзначыць 17 красавіка, але мерапрыемствы па святкаванні ўжо ідуць поўным ходам. Напрыклад, днямі адміністрацыя прымала гасцей: дэлегацыі з гарадоў-пабрацімаў — эстонскага Маарду і расійскага Ніжняга Ноўгарада.

Трэба адзначыць, што супрацоўніцтва Фрунзенскага раёна з Маарду ў 2015 годзе адбывалася ў сферах адукацыі, культуры, мастацтва і маладзёжнай палітыкі. Ёсць у партнёраў і агульныя інтарэсы ў сферах бізнесу і спорту (у прыватнасці, прамысловыя арганізацыі Фрунзенскага раёна зацікаўлены ў пашырэнні эканамічных адносін з суб'ектамі гаспадарання Ніжагародскай вобласці пры рэалізацыі мерапрыемстваў па падрыхтоўцы і правядзенні на тэрыторыі вобласці гульняў чэмпіянату свету па футболе 2018 года). У 2016 годзе адміністрацыя раёна імкнецца ўмацаваць ужо існуючыя сувязі і завесці новыя плённыя адносіны. Так, да юбілею ў Мінск з дэлегацыямі прыехалі мэр Маарду Валеў Кальд і выканаўца абавязкаў кіраўніка адміністрацыі Канавінскага раёна Ніжняга Ноўгарада Міхаіл Шароў.

— У прадстаўнікоў дэлегацый праграма вялікая. Яны наведваюць нашы прадпрыемствы і іншыя аб'екты. Мы прыязджалі ў Маарду на Дні беларускай культуры, прадстаўнікі Маарду самі прыязджалі да нас. Нашы школы сябруюць паміж сабой. А з Ніжнім Ноўгарадам сёння падпісана дамова аб супрацоўніцтве, — расказала «Звяздзе» **намеснік кіраўніка адміністрацыі Фрунзенскага раёна Наталля ПРАСКУРАВА.**

Ірына КАНАПЕЛЬКА (у цэнтры) і старшыні прафсаюзаў буйных прадпрыемстваў раёна.

Адным з крокаў для пашырэння стасункаў стала, напрыклад, правядзенне для прадстаўнікоў дэлегацый экскурсіі па Мінску і асобна — па Фрунзенскім раёне. Спецыяльна для яе быў замоўлены двухпавярховы экскурсійны аўтобус City Tour, дзе з камфортам размясціліся госці, а таксама запрошаныя ветэраны і прадстаўнікі прафсаюзных арганізацый. Гід Нацыянальнага агенцтва па турызме Вольга Залуцкая правяла для гасцей аглядную экскурсію па горадзе. Яна пазнаёміла іх з двума галоўнымі праспектамі сталіцы — Незалежнасці і Пераможцаў.

Затым слова ўзяла старшыня Фрунзенскага раённага аб'яднання арганізацый прафсаюзаў Ірына Канапелька, якая расказала, што межы раёна змяняліся шэсць разоў. Неверагодная колькасць цікавых фактаў, аб'ектаў, імёнаў і назваў сплецена ў яго гісторыі. Тут і самая старая на гэтай тэрыторыі вуліца Кальварыйская, якая згадвалася яшчэ ў 1700 годзе, і аднайменныя старажытныя могілкі, уключаныя ў спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў, і сухараўскія курганы XI—XII стагоддзяў, і частка біўня маманта, знойдзенага рабочымі пры пракладцы водаправода ў 1976 годзе ў раёне Пушкінскай плошчы. У межы раёна ўвайшлі вёскі, што калісьці прымыкалі да яго — Сухарава, Бараноўшчына, Кунцаўшчына, Дамброўка, Цівалі, Мядзведжына, Масюкоўшчына. Адміністрацыя імкнецца захаваць гэтыя гістарычныя найменні ў сучаснай гарадской тапаніміцы.

Цяпер на тэрыторыі раёна рэалізуецца 57 інвестпраектаў, пражывае трэцяя частка шматдзетных сем'яў горада. У Каменнай Горцы плануецца сёлета адкрыць два дзіцячыя садкі, дзіцячую паліклініку, у наступным годзе — два дзіцячыя садкі і паліклініку для дарослых. У былой вёсцы Сухарава праектуюцца школа і два дзіцячыя садкі. Таму Фрунзенскі раён можа не толькі ганарыцца слаўнай мінуўшчынай, але і будаваць паспяховую будучыню.

Дзіяна СЕРАДЗЮК. *seradzyuk@zviazda.by*

■

■ Незвычайная глыбінка

«ГАЛОЎНЫ САПЕРНІК — ШТАНГА»

Правілы жыцця самага моцнага дзядулі ў свеце



Ён нагадвае волатаў, высечаных з мармуру старадаўнімі скульптарамі. Магутны, шырокі ў плячах. Пра такіх у нас гавораць — моцны, як дуб. І ніхто не скажа, што гэтаму мацаку, сямнаццаціразоваму чэмпіёну Беларусі па паўэрліфтынгу сярод ветэранаў, сусветнаму рэкардсмену, ідзе 65-ы год. Ды і казаць пра ўзрост неяк не хочацца, хоць міжволі да гэтай тэмы вяртаешся. Сваіх самых значных спартыўных перамог ён дасягнуў тады, калі многія былыя славутыя спартсмены, яго аднагодкі, нават на прабежку не выходзяць. Вось такі самародак жыве пад Смалявічамі, у невялічкім пасёлку Акцябрскі.

«Да мяне прыходзяць займацца мае ўнукі»

— Ну што, можа, чайнік спачатку паставім? — запусціўшы нас у трэнажорную залу мясцовага фізкультурна-аздараўленчага комплексу, кажа Міхаіл Вярбіцкі. І пакуль ён хадзіў па ваду, мы з фатографам агледзеліся.

Зала даволі сціплая. На сценах, каля люстэрак, развешаны каляровыя афішы спаборніцтваў, плакаты славутых волатаў з галівудскай усмешкай. Акуратна складзены «бліны», грыфы, самаробныя снарады... На стале ў стосе — канспекты хлопцаў, што займаюцца тут цяжкай атлетыкай. «Зала ў нас, безумоўна, не гламурная, — пазней скажа трэнер Андрэй Булаўскі, паплечнік Вярбіцкага. — Але ў такіх звычайна растуць чэмпіёны. Бо што для трэніровак патрэбна? Набор «жалеза». Для нашага героя яна і стала сапраўднай кузняй рэкордаў. Менавіта тут ён рыхтаваўся да ўсіх сваіх самых значных перамог, пасля якіх яго ласкава празвалі самым моцным дзядулем у свеце.

— На такую мянушку я не крыўдую, — усміхаецца суразмоўца. — Мне нават прыемна. А што тут такога? Яны ж па-добраму кажуць. З павагай. Галоўнае, каб душа была маладая. А так я ж сапраўдны дзед. І ў нашу секцыю па цяжкай атлетыцы прыходзяць займацца мае ўнукі: адзін родны, другі стрыечны.

А пачалося ўсё яшчэ паўстагоддзя таму. Міхаіл Вярбіцкі нарадзіўся непадалёк ад Барысава, у вёсцы Залессе.

— Там усе мае продкі жылі, — узгадвае волат. — А прадзед удзельнічаў у будаўніцтве барысаўскага сабора — бярвёны цягаў. Так што моц мая закладзена ў генах.

Трэніравацца Вярбіцкі распачаў у вёсцы. Ён самавук. Навучаўся па кніжцы «Атлетызм». Кумірам быў славуты цяжкаатлет Юрый Уласаў, пасля — Арнольд Шварцэнегер. Браў лом, мацаваў на яго колы ад трактара і ўздымаў як штангу. Апорай для турніка служылі дзве шпалы, а папярэчынай — жалезны прут, на якім ён падцягваўся. А калі халадала, хадзіў трэніравацца ў кантору да бацькі, які працаваў на чыгунцы. У 18-гадовым узросце ён падняў 300 кілаграмаў. Без тэхнікі. Без нармальнай падрыхтоўкі. Праз тры гады Міхаіл выканаў норму майстра спорту.

— А вы ніколі не хацелі стаць прафесійным спартсменам? — пытаюся ў Вярбіцкага, які ўжо пераадзеўся і пакрысе рыхтуецца да размінкі.

— Хацеў. Збіраўся нават ехаць у Шахты да славутага Рудольфа Плюкфельдэра, трэнера алімпійскага чэмпіёна Давіда Рыгерта. Планаваў застацца там, паступіць у вучылішча. Але бацька адгаварыў. І я, па вялікім рахунку, не шкадую.

Міхаіл Вярбіцкі доўгі час служыў войску, потым узначальваў спартыўную школу, а цяпер працуе трэнерам па цяжкай атлетыцы. У 2013-м разам з сынам упершыню паехаў на міжнародныя спаборніцтвы па паўэрліфтынгу ў Мікалаеў. І не прагадаў — перамог. З той адметнай для яго гісторыі і пачалося спартыўнае ўзыходжанне. Так, як кажа Міхаіл Вярбіцкі, ён прабіў сабе акно ў Еўропу.

— Я доўгі час спаборнічаў разам з «дзьмухаўцамі», такімі, як я, — сцвярджае Вярбіцкі. — Але я ўсіх перамог і мне проста надакучыла. Помню, быў выпадак, калі сам судзіў спаборніцтвы. Спартсмен узяў вагу. Стаў чэмпіёнам. А я выйшаў пасля на памост не ў экіпіроўцы — у штанах, туфлях — і падняў больш, чым ён. Штаны, праўда, лопнулі, але нічога... Хоць пасля зразумеў, рабіць так непрыгожа. Прыніжаць свайго сапернікам ніякім чынам нельга. Цяпер я перайшоў у іншую версію і спаборнічаю з больш маладымі сапернікамі.

— А ці не занадта гэта для вашага сэрца?

— «Матор» працуе добра. Ціск таксама ў норме. Што казаць, калі ў 59 гадоў у мяне нарадзілася дачка, а мая жонка маладзейшая за мяне на 23 гады. Мне здаецца, гэта пра нешта сведчыць. Так, я ўжываю фармакалогію, але вельмі акуратна. Са спартыўнымі дабаўкамі не забаўляюся. Ем толькі здаровыя прадукты. У маёй маладосці ніхто падобнага не ўжываў і людзі дэманстравалі добрыя вынікі. Свежае яйка, два літры сырадою ўвечары, кавалак сала — для мяне гэта было нормай. Адчуваў сябе цудоўна.

— Выпіваеце?

— Ляпіць кожны дзень з ранку да вечара вельмі складана. Гэта цяжка і фізічна, і псіхалагічна. Трэба запаўняць сябе нечым яшчэ, тым, што кладзецца на душу і прыносіць асалоду. Не толькі мне, але і людзям, якія побач. Пачаткам усяго было юнацтва, школа. Тады я па-аматарску займаўся музыкай, іграў на цымбалах. Але захапленне засталося на ўсё жыццё. Цяпер я граю ў асноўным на гітары, выконваю рамансы, ды і цымбалы, балалайку іншы раз кранаю, каб атрымаць асалоду ад гучання. Што да малявання, то мне заўсёды было прыемна бачыць прыгожыя краявіды, нацюрморты, але ў самога доўга не атрымлівалася авалодаць тэхнікай жывапісу. Капіраваў майстроў, спрабаваў ездзіць на пленэры. І з цягам часу за кошт вялікай колькасці працы я дасягнуў нязначнага поспеху. Раней з дзесяці работ удалай мог назваць толькі адну, а цяпер атрымліваюцца тры-чатыры.

— Гледзячы на вашы скульптуры, нельга не заўважыць іх незвычайную жывасць. Нават выкананыя ў бронзе, яны не грувасткія, але пластычныя, лёгкія. Здаецца, конь вось-вось пабяжыць, мядзведзь затанцуе. Гэта нейкі прафесійны сакрэт?

— Тут сакрэту няма. Гэта проста адказнасць: калі адказна ставішся да працы, усё павінна атрымацца выдатна. Скажу шчыра, бывае, што і мне нешта не ўдаецца, тады звяртаюся да калег па парады. Таго ж коніка ў Зэльве я доўга ляпіў, але пабачыў, што ён недасканалы. Тады звярнуўся да Яўгена Колчава, ён шмат дапамог, бо сам я добра не ведаю адметнасцяў анатоміі каня. Прывяду яшчэ адзін прыклад. Я рабіў мемарыяльную дошку на дом, дзе некалі жыла дырыжор сімфанічнага аркестра опернага тэатра Таццяна Каламійцава. Яе вобраз вельмі складаны. Але з дапамогай скульптара Міколы Бакуменкі, які выдатна ўмее рабіць мемарыянльныя дошкі, а таксама музыканта, былога калегі Таццяны Міхайлаўны мы здолелі выканаць выдатную работу. Я шчыра расказваю пра такія выпадкі і пазначаю імёны тых, хто дапамог, як суаўтараў. Таксама заўсёды кажу, што не трэба саромецца прасіць дапамогі ў калег.

— А калі да вас звяртаюцца з просьбамі дапамагчы, адгукаецеся?

— Заўсёды. Але калі ў кампазіцыйным плане скульптура нецікавая, то адмаўляюся. Я часта працаваў над арганізацыяй выставак дзіцячых работ. А колькі гадоў таму мяне запрасілі працаваць над мемарыялам Першай сусветнай вайны ў Смаргоні. Працы па ўзвядзенні комплексу яшчэ шмат, але вынікі ўжо ўражваюць.

Кожны настаўнік павінен падрыхтаваць сабе вучня, каб потым было ў каго вучыцца. У мяне так і адбылося.

«На Купалле». 2006 г. Палімер.

«Матэрыяльныя здабыткі вельмі хутка знікаюць, а сорам за недаробленае, няправільна прынятыя рашэнні застаецца».

— У якім жанры скульптуры вам найбольш падабаецца працаваць?

— Думаю, усё ж у манументальным мастацтве. Па-першае, гэта праца для людзей: помнікі, гарадскія скульптуры могуць быць напамінам ці пра добрую падзею, ці трагічную. Усё патрэбна. А па-другое, мне па жыцці неяк пашанцавала, што я ні разу не памыліўся ў вызначэнні памераў скульптур. А гэта вельмі важна. Нават пры ўстаноўцы мядзведзяў, што ў Смаргоні, мы спачатку рабілі з кардону шаблоны ў натуральную велічыню і «прымяралі» іх на мясцовасці. Таму што ў прасторы ёсць тэндэнцыя «з'ядаць» памер скульптуры. Калі чалавека вылепіць ў натуральны памер, то будзе падавацца, што ён вельмі маленькі. Знайсці правільны памер, арганізаваць асяроддзе досыць складана. Але я ніколі не запрашаў архітэктараў. Сярод іх вельмі мала тых, хто працуе ў манументальнай скульптуры. Але і прафесія архітэктара яшчэ не гарантуе таго, што чалавек здолее «пасадзіць» помнік ці фігуру ў асяроддзе. Трэба мець нейкае сёмае пачуццё, каб зрабіць усё правільна.

— Можна выдатна вывучыць прастору, адчуваць яе, калі працуеце ў адным горадзе. Але ж вашы скульптуры стаяць у розных гарадах — Гродне, Смаргоні, Зэльве, Слоніме, Вялікай Бераставіцы, іншых мясцінах. Адмыслова ездзіце на «разведку», прымяраецеся?

— Зусім не. Тут я як фатограф — адразу бачу і месца, і памер скульптуры. Для сябе нават выпрацаваў правіла: першы варыянт — самы правільны, дакладны. Гэта не лянота. Я ўжо на ўласным вопыце ведаю, колькі потым эскіз ні змяняй, усё роўна вяртаюся да самага першага.

— Над чым плануеце працаваць у будучыні? Яшчэ маеце запал, натхненне да творчасці?

— Гледзячы наперад, планую глінку замяшаць, паспрабаваць печку падрыхтаваць, вярнуцца да керамікі. Гэта вельмі цёплы матэрыял, які дае магчымасць выказацца ў рабоце невялікага памеру, выдатна перадае настрой. Калісьці я шмат займаўся керамікай, і след ад яе застаўся ў памяці, яна ўсё яшчэ кранае душу.

— Бадай, у кожнага творцы ёсць праекты, над якімі праведзена шмат часу, ім аддадзена многа сіл і працы, але якія так і не былі рэалізаваныя. Ці ёсць такія ў вас?

— Так, на жаль. У мяне больш як сорак няздзейсненых праектаў. Адзін з іх — арка з аленем святога Губерта — гербам Гродна. Мару яе паставіць на плошчы ў цэнтры горада. Яшчэ адзін цікавы праект — «Свіцязянка» па баладзе Адама Міцкевіча. На Свяцязі ўстанавілі толькі адну скульптуру дзяўчыны-свіцязянкі, але паводле маёй задумкі тут павінен быць цэлы комплекс: скульптура самога Міцкевіча, вянок са скарочаным тэкстам балады, каб тыя, хто адпачывае ў санаторыі Беларускай чыгункі на Свіцязі, маглі разумець сэнс усёй кампазіцыі.

— Ці маеце вучняў, якім перадалі майстэрства, з якімі шмат працавалі і працуеце?

— Ёсць адна вучаніца. Я з ёй разам працую 17 гадоў, яшчэ з тых часоў, калі выкладаў у Гродзенскім каледжы мастацтваў. Тады распрацаваў уласную праграму навучання скульптуры на чатыры гады. І адна з вучаніц, Марына Чайко, скончыла вучылішча, паступіла ў Акадэмію мастацтваў на аддзяленне мастацтвазнаўства, потым была аспірантура. І летась яна абараніла кандыдацкую дысертацыю па тэме «Манументальная скульптура Беларусі на мяжы XX і XXI стагоддзяў». Думаю, што і мая заслуга ў гэтым ёсць, нават проста ў выбары тэмы. Кожны настаўнік павінен падрыхтаваць сабе вучня, каб потым было ў каго вучыцца. У мяне так і адбылося.

Фрагмент скульптуры «Дрэва жыцця» да 500-годдзя заснавання Вялікай Бераставіцы. 2006 г. Бронза.

«Калі пераглядаю сваю творчасць, нейкія работы падабаюцца больш, нейкія менш, але ўсе яны — перажытыя».

— Што параілі б скульптарам-пачаткоўцам? Якую мудрасць перадалі б ім?

— Менш захапляцца інтэрнэтам, не імкнуцца быць модным і сучаснымі, кіравацца знакамітым выказваннем паэта: «не рабіце пад Маякоўскага, а рабіце пад сябе». Калі пераглядаю сваю творчасць, нейкія работы падабаюцца больш, нейкія менш, але ўсе яны — перажытыя. Адна справа — пражыць, адчуць, унесці асабістыя рысы, зусім іншая — проста зачыніцца ў майстэрні і зрабіць абсалютна безаблічны твор. Калі нешта ёсць у сэрцы — трэба праз гэта пазнаваць сябе. Варта шукаць, рабіць менавіта тое, што хочацца выказаць. Другая парада — працаваць. Натхненне не прыходзіць да гультаёў. Я ўсё жыццё шмат працаваў, ад гэтага, магчыма, пакутавала сям'я, але мастацтва патрабуе такой ахвяры. Варта адчуваць, што гэта тваё, што ты займаешся любімай працай.

— Вы жылі і ў розных гарадах краіны — Гродне, Мінску, Смаргоні...

— Само жыццё мяне рухала. Не застаўся ў Мінску пасля заканчэння тэатральна-мастацкага інстытута, хоць маю дыплом з адзнакай. Я баяўся, саромеўся мэтраў у скульптуры. Вясковы хлопец, быў заўсёды сціплым, ціха вучыўся, бачыў, што побач са мной больш таленавітыя людзі. Але стараўся, адолеў праграму. Сам выбраў Гродна як месца для працы, бо раней там часта бываў яшчэ школьнікам. Адпрацаваў тут 27 гадоў. Потым дачка паступіла ў Мінск у Акадэмію мастацтваў, абрала спецыяльнасць дызайнера. Таму паехаў за ёй, каб дапамагчы. Пасля заканчэння акадэміі яна вярнулася ў Гродна, а я застаўся ў Мінску. Дарэчы, дачка і сёння шмат дапамагае ў праектаванні маіх задум, за што я вельмі ўдзячны.

— Сакрэт шчаслівага жыцця для вас?

— Калі жыў у сталіцы, быў вельмі шчаслівы. Побач філармонія, дзе праходзіла шмат выдатных канцэртаў, часта наведваў балет. У Мінску можна паслухаць шмат выключнай музыкі. Гэта для мяне вельмі важна. Таксама цягам апошніх гадоў шмат падарожнічаў. Аб'ехаў многа гарадоў у Еўропе: быў у Рыме, Фларэнцыі, Венецыі, Сан-Марына, Бруселі, Вене, Мюнхене, Дрэздэне... Падарожжы — гэта неверагоднае духоўнае багацце. Так што я — багаты чалавек.

— Да свайго 70-годдзя падышлі менавіта з такой думкай?

— Сапраўды. Шчасце — гэта напоўненасць жыцця. Я разумею, што грошы, матэрыяльныя здабыткі вельмі хутка знікаюць, а сорам за недаробленае, няправільна прынятыя рашэнні застаецца. Я ўсё жыццё працаваў так, каб не было сорамна, і мэты сваёй дасягнуў.

Марына ВЕСЯЛУХА.
vesialuha@zviazda.by
Фотаздымкі з асабістага архіва Уладзіміра ЦЕРАБУНА.

«Жалейка». 1987 г. Дрэва.

■ Ініцыятыва

БУДУЧЫНЯ ДЛЯ КОЛАСА

Больш як сто школьнікаў з розных куткоў Беларусі сабраліся ў чацвер у Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа

У час заняткаў па секцыях.

Нагодай для візіту стала першая навукова-практычная канферэнцыя для навучэнцаў сярэдніх школ і гімназій, прымеркаваная да 110-годдзя творчай дзейнасці класіка. Падчас пасяджэнняў трох секцый вучні прадставілі больш як 60 дакладаў, прысвечаных аналізу розных аспектаў яго творчасці.

Ідэя правядзення падобнай сустрэчы з'явілася зусім нечакана. **Настаўніца сталічнай гімназіі №192 Святлана ТАРАНДА,** чые вучні спачатку бралі ўдзел у раённай канферэнцыі, а сёння прадставілі сваю работу ў музеі, расказала:

— Мы звярнуліся ў музей з ідэяй правесці вучнёўскую канферэнцыю, прысвечаную Коласу. Бо разам з вучнямі хацелі апынуцца ў коле даследчыкаў-пачаткоўцаў, якія зацікаўленыя вывучэннем менавіта спадчыны Коласа. У музеі ідэю падтрымалі, але ж мы не чакалі, што задумка выкліча такі рэзананс.

Дарэчы, у доме Коласа вучні Святланы Сцяфанаўны прадставілі сапраўды вялікі праект, прысвечаны вывучэнню старонак ваеннага жыцця пісьменніка. Маладыя даследчыцы Карына Зяленская і Марына Карпік прааналізавалі напісаныя ў гады вайны лісты Коласа да Міхася Лынькова, Петруся Броўкі, Алены Броўкі, да жонкі Марыі Дзмітрыеўны. Вучаніцы суаднеслі іх з творамі

Сын Якуба Коласа доктар тэхнічных навук Міхась Канстанцінавіч МІЦКЕВІЧ з удзельнікамі канферэнцыі.

ваеннага часу і падзеямі ў асабістым жыцці Коласа. Атрымалася глыбокае і грунтоўнае даследаванне.

Самі дзевяцікласніцы сваю зацікаўленасць ліставаннем Коласа патлумачылі так:

— Калі чытаеш творы класіка, то бачыш яго асобу толькі з аднаго боку. Калі чытаеш лісты — знаёмішся з зусім іншым Коласам, даведваешся пра яго жыццё. І наадварот, лісты дазваляюць па-іншаму зірнуць на яго вершы, паэмы.

У кола навуковых інтарэсаў іншых удзельнікаў канферэнцыі трапіла педагагічная дзейнасць Коласа, яго вандроўкі і

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

грамадская праца. Шмат увагі вучні звярнулі на паэму «Новая зямля», раскрылі яе энцыклапедычны характар і разгледзелі асобныя складнікі сюжэта. Даследчыцкі інтарэс школьнікаў выклікала і паэма «Сымон-музыка». Так, шасцікласніцы Настасся Лукашэнка і Уладзіслаў Марцішэвіч прааналізавалі адметнасці вобраза мастака і мастацтва ў гэтым творы і параўналі бачанне Коласа з успрыманнем свету творчасці сучаснымі школьнікамі.

Не засталіся без увагі і жыццёвыя пуцявіны Коласа. Маладыя даследчыкі Вадзім Сімановіч з Мінска і Сафія Левая з Піншчыны прайшліся сцежкамі класіка, атрымалі асалоду ад яго родных краявідаў. Дарэчы, падчас канферэнцыі закраналася і вельмі складаная, комплексная тэма адлюстравання вобраза горада ў творчасці Якуба Коласа і яго сучасніка Максіма Багдановіча. Дзесяцікласніцы Анастасія Балоціна і Марына Танковіч з Чэрвеня прадставілі даследаванне ўрбаністычнай тэматыкі ў творах класікаў.

У цэлым тэматычны абсяг работ маладых аўтараў здзіўляе сваёй шырынёй. Няма сумневу ў тым, што вучні самі праводзілі даследаванні, чыталі і аналізавалі творы. Натуральна, пад мудрым кіраўніцтвам настаўнікаў.

Вітаючы маладых даследчыкаў, **дырэктар музея Якуба Коласа Зінаіда КАМАРОЎСКАЯ** выказала спадзяванне, што такія канферэнцыі для вучняў стануць традыцыйнымі ў музеі. Гэта як падмурак у будучыню вялікіх «Каласавінаў», якія ўвосень пройдуць у доме класіка ужо трыццаты раз.

Іншыя выступоўцы — **дырэктар Нацыянальнага інстытута адукацыі Сяргей ВАЖНІК, дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда» Алесь КАРЛЮКЕВІЧ, паэт, старшыня Мінскага гарадскога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Міхась ПАЗНЯКОЎ** у сваіх прывітальных словах адзначалі важнасць добрага пачатку навуковай працы вучняў, выказвалі радасць ад сустрэчы і спадзяванне на тое, што даследчыцкая дзейнасць удзельнікаў канферэнцыі будзе мець працяг, а першыя артыкулы перарастуць у кандыдацкія і нават доктарскія дысертацыі.

Дарэчы, з работамі маладых даследчыкаў, прадстаўленымі на канферэнцыі, можна будзе пазнаёміцца ўвосень: плануецца публікацыя зборніка.

Думаецца, гэты дзень школьнікам і іх настаўнікам запомніцца надоўга. У Коласавым доме яны не толькі атрымалі магчымасць прадставіць свае першыя навуковыя работы, але і сустрэліся з вядомымі пісьменнікамі, навукоўцамі, а самае галоўнае — пабывалі ў доме класіка і пазнаёміліся з яго сынам Міхасём Канстанцінавічам. Таму не выпадае сумнявацца, што канферэнцыя будзе мець плён у будучыні, а творчасць Коласа стане аб'ектам даследавання новых і новых пакаленняў навукоўцаў.

Марына ВЕСЯЛУХА.
vesiluha@zviazda.by

■ Форум

ПАД ЗАКРЫТЫМ НЕБАМ

Два кінафестывалі пакажуць на вялікім экране класіку жанру і сучаснае скандынаўскае кіно

Красавік сканцэнтраваў шэраг цікавых і важных кінападзей. Адзін за адным свае праграмы абвясцілі чаканыя пастаўшчыкі класічных і найноўшых кінакарцін, якіх не ўбачыш у звычайным пракаце. Апроч фестывалю кароткаметражнага кіно Cinema perpetuum mobile, пра які мы ўжо пісалі (заўтра адбудуцца яго апошнія паказы ў Мінску), на вялікім экране будзе паказана класіка ў суправаджэнні сімфанічнага аркестра на фестывалі кіно і музыкі «Кінемо» і скандынаўскія карціны на другім па ліку форуме «Паўночнае ззянне».

«Кінемо» вядомы нам арганізацыяй утульных кінавечароў пад адкрытым небам. Нямыя фільмы праецыруюцца на экран, тапёры суправаджаюць іх жывым агучваннем, а гледачы размяшчаюцца на лаўках і пледах у дворыку музея Заіра Азгура (апроч Мінска, паказы арганізуюцца ў іншых абласных цэнтрах). Гэта вандраванне ў часе, вяртанне ў эпоху нямога чорна-белага кіно, зварот да пэўных жанраў — дэтэктываў і камедый. Дзве красавіцкія суботы, праведзеныя ў кінатэатры «Масква», паслужаць аперытывам для летніх кінасеансаў пад адкрытым небам. 16 і 30 красавіка ў праграме фестывалю сапраўдныя каралі ў сваіх жанрах — аўтар дэтэктываў і трылераў Альфрэд Хічкок і комік Бастэр Кітан з яго сумнымі вачыма.

Сёння на экране «Масквы» будзе паказаны фільм з брытанскай фільмаграфіі Хічкока «Жыхар: Гісторыя лонданскага туману» (яго галівудская кар'ера — карціны «Вяроўка», «Галавакружэнне», «На поўнач праз паўночны захад», «Псіха» і іншыя — вядомая больш). Гэта трэцяя па ліку мастацкая стужка рэжысёра, якую ён назваў першым сапраўдным хічкокаўскім фільмам. Класік сусветнага кінематографа, аўтар найлепшых дэтэктываў, майстар саспенсу Альфрэд Хічкок найбольш поўна раскрываецца ў цэлым праекце «Пад знакам Хічкока», які зараз паказвае праграму ў Мінску — гэта рэтраспектыва найлепшых карцін рэжысёра ў кінатэатры «Ракета» (з 11 да 22 красавіка), карціна «У выпадку забойства набірайце «М» у фармаце 3D у кінатэатры «Кіеў» (з 28 красавіка да 4 мая) і дакументальная карціна «Хічкок/Труфо» з праграмы Канскага кінафестывалю, якая ўжо амаль выйшла з пракату.



Што тычыцца «Гісторыі лонданскага туману», героем тут з'яўляецца серыйны забойца, які па начах нападае на маладых бландзінак (на месцы галоўных і не толькі гераінь у Хічкока ў асноўным бландзінкі) і пакідае паперкі з надпісам «Мсцівец». У дом, дзе жыве паліцэйскі, што расследуе забойствы, засяляецца новы пастаялец...

У другую суботу будуць паказаны два камедыйныя фільмы Бастэра Кітана — «Шэрлак малодшы» і «Асаблівы знак». Як заўсёды, няўдачлівы, але знаходлівы герой Кітана альбо церпіць правалы ў справах кахання, альбо трапляе ў пераплёты, альбо ўсё разам. У «Шэрлаку малодшым» правінцыйны кінамеханік прыходзіць сватацца да каханай дзяўчыны, але аказваецца абвінавачаным у крадзяжы гадзінніка яе бацькі. Вечарам у сне ён становіцца героем, які феерычна расследуе справу крадзяжу караляў.

У дваццаціхвілінным «Асаблівым знаку» галоўны герой прыходзіць на працу ў цір, дзе падманам дэманструе сваю выключную меткасць. Начальнік, які аказваецца верхаводам банды, запрашае падначаленага на іншую працу.

Музыку да фільмаў «Жыхар: Гісторыя лонданскага туману» і «Шэрлак малодшы» напісала кампазітар Вольга Падгайская, выконваць гэтыя работы будзе сімфанічны аркестр музычнай капэлы «Сонорус» пад кіраўніцтвам Аляксандра Хумала. Кароткаметражку Кітана «Асаблівы знак» агучыць тапёр — Кацярына Марэцкая. Тут пэўныя напрацоўкі суседнічаюць з імправізацыяй.

Як заўсёды, няўдачлівы, але знаходлівы герой Кітана альбо церпіць правалы ў справах кахання, альбо трапляе ў пераплёты, альбо ўсё разам.

Кінафестываль «Паўночнае ззянне» пакажа «Харастко штодзённага» ў васьмі кінакарцінах паўночнаеўрапейскіх краін — Швецыі, Фінляндыі, Нарвегіі, Даніі і Ісландыі. Паказы адбудуцца з 21 да 24 красавіка ў кінатэатрах «Мір» у Мінску і Віцебску. Гэта найноўшыя скандынаўскія фільмы (2013-2015 гадоў), здольныя расказаць беларускаму гледачу пра побыт і менталітэт іншых народаў і паказаць прыгажосць, якая хаваецца ў штодзённых звычайных рэчах: «Вясковыя жыхары» Мар'і Пююкко з Фінляндыі, «Лэнд Хо!» Аарана Каца і Марты Сцівенс з Ісландыі, «Ітсі-бітсі» Оле Крысціяна Мадсэна з Даніі, «Супраць прыроды» Оле Г'явера і Мартэ Вольд з Нарвегіі, «Мая худзенькая сястра» Саны Ленкен са Швецыі, «Перашкоды» Алексі Салменпера з Фінляндыі, «Гара нявіннасці» Дагура Кары з Ісландыі і дацкая карціна з інтрыгуючай назвай «Секс, наркотыкі і падаткаабкладанне» Крыстафера Боэ.

Фінскую карціну «Вясковыя жыхары» прадставіць уласна рэжысёр Мар'я Пююкко, яна ж 21 красавіка прачытае лекцыю «Жанчыны ў Нардычным кінематографе» ў Інстытуце журналістыкі БДУ, а 22-га правядзе інтэрактыўны майстар-клас для будучых акцёраў у Віцебскім дзяржаўным каледжы культуры і мастацтваў.

Дырэктар Дацкага інстытута культуры ў Рызе Сімон Друсэн Хольмберг 22 красавіка ў сваёй лекцыі, якая адбудзецца ў Акадэміі мастацтваў, распавядзе, «як Данія здолела ператварыць нацыянальны кінематограф у міжнародны кінабрэнд з зорнымі імёнамі». Праход на лекцыі і майстар-клас вольны.

З кінафэстамі, на якіх можна ўбачыць класіку і сучаснае мастацтва, жанравае і аўтарскае кіно, майстэрства Хічкока, Кітана і скандынаўскі дух у кінематографе, вялікі экран не апусцее.

Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.
katsyalovich@zviazda.by

ТЕХНОБАНК

ОАО «Технобанк»
220002, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Кропоткина, 44,
Телефон: +375 17 283 15 10

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 апреля 2016 г.

Наименование банка: ОАО «Технобанк» (в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	2016 год	2015 год
1	2	3	4	5	6
1	**АКТИВЫ**				
2	Денежные средства	1101		317 578	193 446
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102		3 502	4 248
4	Средства в Национальном банке	1103		247 298	141 385
5	Средства в банках	1104		480 798	183 992
6	Ценные бумаги	1105		508 798	288 580
7	Кредиты клиентам	1106		1 433 417	1 177 950
8	Производные финансовые активы	1107		-	-
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108		20	52
10	Основные средства и нематериальные активы	1109		296 364	218 911
11	Имущество, предназначенное для продажи	1110		11 087	36 898
12	Отложенные налоговые активы	1111		-	-
13	Прочие активы	1112		125 032	31 919
14	**ИТОГО активы**	11		**3 423 894**	**2 277 381**
15	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**				
16	Средства Национального банка	1201		14	386
17	Средства банков	1202		555 810	235 322
18	Средства клиентов	1203		2 268 964	1 495 825
19	Ценные бумаги, выпущенные банком	1204		19 586	5 087
20	Производные финансовые обязательства	1205		-	-
21	Отложенные налоговые обязательства	1206		-	-
22	Прочие обязательства	1207		33 426	27 198
23	**ВСЕГО обязательства**	120		**2 877 800**	**1 763 818**
24	**СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ**				
25	Уставный фонд	1211		111 989	112 000
26	Эмиссионный доход	1212		-	-
27	Резервный фонд	1213		51 504	17 297
28	Фонд переоценки статей баланса	1214		185 149	182 899
29	Накопленная прибыль	1215		197 452	201 367
30	**ВСЕГО собственный капитал**	121		**546 094**	**513 563**
31	**ИТОГО обязательства и собственный капитал**	12		**3 423 894**	**2 277 381**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 1 апреля 2016 г.

Наименование банка: ОАО «Технобанк» (в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	2016 год	2015 год
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011		72 793	66 103
2	Процентные расходы	2012		45 443	30 432
3	**Чистые процентные доходы**	201		**27 350**	**35 671**
4	Комиссионные доходы	2021		28 372	30 303
5	Комиссионные расходы	2022		7 433	4 364
6	**Чистые комиссионные доходы**	202		**20 939**	**25 939**
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203		340	125
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204		4	1 189
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205		33 902	18 415
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206		-	(672)
11	Чистые отчисления в резервы	207		30 242	23 630
12	Прочие доходы	208		31 036	2 001
13	Операционные расходы	209		75 604	45 212
14	Прочие расходы	210		3 852	3 253
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211		3 873	10 573
16	Расход (доход) по налогу на прибыль	212		170	2 388
17	**ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)**	2		**3 703**	**8 185**

Председатель Правления **Д.Л.Михалевич**

Главный бухгалтер **Н.А.Кузьмицкая**

Дата подписания «04» апреля 2016 г.

Данная отчетность размещена на странице интернет-сайта: https://tb.by/about/bank/finance/

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 11 от 31.12.2013 г. УНП 100706562

ГОДОВОЙ ОТЧЕТ ОАО «МОНТАЖЛЕГМАШ» за 2015 год
Бухгалтерский баланс на 1 января 2016 года

АКТИВ		ПАССИВ	
Наименование статей	**Сумма, млн руб.**	**Наименование статей**	**Сумма, млн руб**
Долгосрочные активы	44 339	Собственный капитал	51 119
Краткосрочные активы	20 000	Обязательства	13 220
БАЛАНС	**64 339**	**БАЛАНС**	**64 339**

Отчет о прибылях и убытках за 2015 год

Наименование показателей	Единица изм.	Сумма
Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг	млн руб.	33 886
Прибыль (убыток) от текущей деятельности	млн руб.	-2 150
Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг, управленческие расходы	млн руб.	33 090
Прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой, иной деятельности	млн руб.	-440
Информация об открытом акционерном обществе и его деятельности		
Кол-во акций, находящихся на балансе	шт.	0
Просроченная кредиторская задолженность	млн руб.	2 671
Просроченная дебиторская задолженность	млн руб.	1 390

Основные виды деятельности:
Производство металлоконструкций, строительно-монтажные работы

Аудиторское заключение

По мнению аудиторской организации ОДО «ПрофАудитКонсалт» бухгалтерская (финансовая) отчетность ОАО «Монтажлегмаш» достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение на 1 января 2016 года и результаты его финансово-хозяйственной деятельности за 2015 год, при этом совершенные ОАО «Монтажлегмаш» финансовые (хозяйственные) операции соответствуют законодательству.

УНП 100120218

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, д. 5, корп. 2, пом. 1703, оф. 5**
Продавец	**ОАО «Белоозерский энергомеханический завод», Брестская обл., Березовский р-н, г. Белоозерск, ул. Заводская, 1**

Предмет аукциона

1. Теплица (назначение – здание специализир. растениеводства) с инв. номером 120/С-14941, пл. **12 913,7 кв.м**

Составные части и принадлежности: быт. помещение 386,7 кв.м, навес для тары 374 кв.м, пункт учета тепла 8,2 кв.м, наруж. сети канализации 407 м, наруж. сети водопровода 1003 м, наруж. сети теплоснабжения 2083 м, водозаборные сооружения, дороги и площадки 7940 кв.м, заглубленная насос. станция 38,9 кв.м, контактный отстойник, два забора 2138 кв.м, кабельные линии электроснабжения 680 м, наруж. освещение 510 м, наруж. слаботочные сети 720 м, ТП 30 кв.м

2. Здание котельной для отопления зимних блочных теплиц (назначение – здание специализир. иного назначения) с инв. номером 120/С-20794, пл. **223,1 кв.м**

Составные части и принадлежности: линия электропередач 105 м, сети водопровода 119 м, сети канализации 70 м, тепловые сети 109 м, труба дымовая, склад топлива 107 кв.м

В состав предмета аукциона входит **оборудование** в количестве 16 единиц (в соответствии с перечнем оборудования, размещенного на сайте организатора аукциона www.cpo.by)

Месторасположение: Брестская обл., Березовский р-н, Белоозерский с/с, д. Нивки

Сведения о земельном участке: предоставлен продавцу для обслуживания теплиц на праве постоянного пользования пл. **6,7317** га. Ограничения (обременения): участок пл. 0,0632 га находится в охранных зонах линий электропередачи

Начальная цена с НДС 20% – 5 242 148 794 белорусских рубля (снижена на 60%)

Задаток 10% от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с №3012343260010, в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи	**15** рабочих дней после проведения аукциона

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, условия оплаты предмета аукциона, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 19.03.2016

Дата и время проведения аукциона: 28.04.2016 в 12.00 по адресу: Брестская обл., Березовский р-н, г. Белоозерск, ул. Заводская, 1, ОАО «Белоозерский энергомеханический завод»

Дата и время окончания приема документов: 27.04.2016 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»

Контактные телефоны: +375 17-280-36-37; +375 29-183-69-71.
E-mail: auction@cpo.by

Извещение о реализации имущества ОАО «Барановичидрев» на торгах 28.04.2016 года

Председатель ликвидационной комиссии ОАО «Барановичидрев» Мищук А.М. проводит торги в форме аукциона по реализации объектов недвижимости и прочего имущества:

Конт. тел.: 8-029-6332490 vel, (029) 2512009 МТС; факс (0163) 453392; e-mal: mischuk_am@mail

Торги состоятся 28 апреля 2016 года, в 14.00 по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. пос. Восточный, 3.

Лот №5 – объект недвижимости, тарно-плотничный цех, пл. 1.584 м², расположенный на земельном участке с кадастровым №141000000003001974, стоимость – 1.556.660.700 рублей, без НДС. Первые повторные торги, скидка составила – 10%

Лот №2 – незавершенное капитальное строение, инв. №110/U-110556, пл. 559,1 м², расположенный на земельном участке с кадастровым №141000000003001974, стоимость – 92.044.400 рублей, без НДС. Шестые повторные торги, скидка составила – 90%.

Лот №3 – объект недвижимости, капитальное строение с инв. № 110/С-110-940, пл. 851,9 м², здание специализированное для обработки древесины, цех сушильных камер на земельном участке с кадастровым №141000000003001974, стоимость – 173.092.500 рублей, без НДС. Шестые повторные торги, скидка составила – 85%.

Лот №4 – турбогенераторная установка ТГ 06С/04-Р13/4,0, для выработки электрической энергии. Мощность – 6000 кВт, стоимость – 558.208.960 рублей без НДС, четвертые повторные торги – скидка составила 80%.

Лот №6 – обрабатывающий центр ЧПУ-ROVER-B/50-BIESSE, инв. №194, предназначен для сверления и фрезерования панелей, стоимость – 815.400.000 рублей без НДС, первые повторные торги, скидка – 10%.

Сумма задатка: 10% от начальной цены лота в рублях РБ.

Получатель платежа: ОАО «Барановичидрев», УНП 200299909; р/с 3012122616138 в ф-ле ОАО «БПС-СберБанк», код 369, г. Барановичи.

Назначение платежа – задаток за участие в аукционе.

Задаток должен быть внесен до подачи заявления на участие в аукционе. Заверенный банком платежный документ прилагается к заявлению.

Заявление на участие в аукционе направляются лицами, желающими принять участие в аукционе, в срок **до 14 часов 00 минут 25.04.2016 г.** организатору торгов председателю ликвидационной комиссии Мищуку А.М. по адресу: 225320, Брестская обл., г. Барановичи, ул. пос. Восточный, 3, ОАО «Барановичидрев».

Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистраций.

Более подробно с условиями аукциона можно ознакомиться на сайтах Госкомимущества и Министерства строительства и архитектуры с 16.04.2016 года.

Председатель ликвидационной комиссии ОАО «Барановичидрев» А.М. МИЩУК

УНП 200299909

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ НА ПРАВО ЗАГОТОВКИ И (ИЛИ) ЗАКУПКИ ДЛИННОПАЛОГО (УЗКОПАЛОГО) РАКА

№ лота	Территория, на которой предоставляется право на заготовку и (или) закупку	Предмет аукциона	Условия заготовки и (или) закупки	Цена предмета торгов (аукциона) (руб.)	Сумма задатка (руб.)	Расходы по формированию и регистрации (руб.)
1.	Клецкий район	право на заготовку и (или) закупку длиннопалого (узкопалого) рака	- предоставление права на заготовку и (или) закупку длиннопалого (узкопалого) рака сроком на пять лет в объемах менее 10 000 кг	4 200 000	2 100 000	2 760 000

1. **Аукцион состоится 25 мая 2016 г. в 11 часов в здании Клецкого райисполкома по адресу: г. Клецк, пл. Маяковского, 10.**

2. Для участия в аукционе приглашаются юридические лица и индивидуальные предприниматели. Участнику необходимо подать соответствующее заявление в Клецкий райисполком.

Лица, желающие принять участие в аукционе, к заявлению прилагают: заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; копию свидетельства о государственной регистрации; копию Устава; а также представляются: доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, при подаче документов на участие в аукционе уполномоченные лица представляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

3. Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 17.00 по адресу: г. Клецк, пл. Маяковского, 10, кабинет 307; последний день приема документов – **20 мая 2016 г. до 11.00.**

Заключительная регистрация участников 25 мая 2016 г. с 10.00 до 10.45. К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

4. Сумма задатка перечисляется на расчетный счет 3641207430710 в ЦБУ № 607 г. Клецк филиала № 620 г. Несвиж ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Клецка код 523. Получатель – Клецкий райисполком. УНП 600198162.

5. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее, чем двумя участниками, если ни один из участников аукциона после трехкратного объявления первой объявленной цены не поднял аукционный номер. Если заявка на участие в аукционе подана только одним участником, право на заготовку (или) закупку предоставляется данному участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

6. Контактные телефоны в Клецке: (8-01793), 50444, 50786, 68232.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «БПХО»

№ п/п	Наименование лота	Местонахождение	Начальная цена продажи, с учетом НДС, руб.	Задаток, 20%
1	**Лот № 9** – капитальное строение: Забор № 2 с инвентарным номером 110/С-111811, площадью 384,0 кв.м	Брестская область, г. Барановичи, ул. Фабричная 7/6, на земельном участке с кадастровым номером 141000000006003885 площадью 0,0108 га	**107 240 400**	**21 448 080**
2	**Лот № 10 –** капитальное строение: Забор № 3 с инвентарным номером 110/С-111812, площадью 844,0 кв.м	Брестская область, г. Барановичи, ул. Фабричная 7/6, на земельном участке с кадастровым номером 141000000006003886 площадью 0,0231 га	**232 087 200**	**46 417 440**

Аукцион состоится 18 мая 2016 г. в 14.00 по адресу: 225410, г. Барановичи, ул. Фабричная, 7 каб. 503, 5-й этаж.

Организатор аукциона: открытое акционерное общество «Барановичское производственное хлопчатобумажное объединение» (ОАО «БПХО», г. Барановичи, ул. Фабричная, 7).

Прием заявлений и документов на участие в аукционе осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 12.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Барановичи, ул. Фабричная, 7, каб. 602. Последний день подачи заявлений на участие в аукционе – **13.05.2016**.

Задаток вносится до подачи заявления на участие в аукционе на р/с 3012605450052 в отделении ОАО «АСБ Беларусбанк», код 150501245, получатель платежа – ОАО «БПХО», УНП 200166488.

Шаг торгов – 5 процентов.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 10 рабочих дней со дня подписания (утверждения) протокола о проведении аукциона. Сроки оплаты за предмет аукциона устанавливаются при заключении договора купли-продажи с продавцом.

Победитель (единственный участник) аукциона в течение 3 рабочих дней после дня проведения аукциона (утверждения протокола) возмещает затраты на организацию и проведение аукциона в соответствии с Соглашением.

Дополнительную информацию можно получить у организатора аукциона: **(80163) 47-63-80, 47-64-93, 47-64-85.**

ДЕЩЕНСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ УЗДЕНСКОГО РАЙОНА МИНСКОЙ ОБЛАСТИ

19 мая 2016 года по адресу а.г. Дещенка, ул. Школьная, 5А, кабинет председателя (2-й этаж) в 10.00 проводит открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность граждан для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

№ лота	Продавец	Местонахождение участка	S (га)	Кадастровый номер	Начальная цена (бел. руб.)	Расходы по подготовке (кроме расходов на публикацию извещения) (бел. рублей)
Лот № 1	Дещенский сельисполком	д. Володьки, ул. Окружная, уч. 27	0,1500	625680202201000280	90 000 000	10535000
Лот № 2	Дещенский сельисполком	д. Городище, ул. Центральная, уч. 2А	0,1332	625680203401000037	90 000 000	11957200
Лот № 3	Дещенский сельисполком	д. Теплень, ул. Новая, уч. 18А	0,1482	625680213201000197	90 000 000	11957200
Лот № 4	Дещенский сельисполком	д. Яченка, ул. Центральная, уч. 71	0,1500	625680215801000167	90 000 000	11957200

Целевое назначение участков — для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов. Имеется возможность подключения к электроснабжению, водоснабжению, газоснабжению.

Задаток в размере 10 процентов от начальной цены земельного участка перечисляется путем безналичных расчетов платежным поручением (квитанцией) на счет № 3641062500114 Дещенского сельского исполнительного комитета в ЦБУ № 625 филиала № 500 Минского управления ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Узда, МФО 153001601, УНП 601068832, код платежа — 04901.

Граждане, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

Заявления на участие в аукционе с необходимыми документами принимаются по адресу: а.г. Дещенка, ул. Школьная, 5А, кабинет управляющего делами (2 этаж), с 8.00 до 17.00 по рабочим дням **по 13 мая 2016 года включительно.**

Участники аукциона должны представить следующие документы:

- заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков;
- заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка;
- копию документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);
- представителем гражданина — нотариально заверенную доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан представляют документ, удостоверяющий личность.

Заключительная регистрация — с 9.30 до 9.45 в день проведения аукциона.

Аукцион состоится по каждому лоту при наличии не менее двух участников.

Оплата победителем за предмет аукциона производится разовым платежом путем безналичных расчетов.

Победителю за предмет аукциона необходимо произвести возмещение фактических расходов по организации и проведению аукциона и подготовке документации для его проведения.

Участники аукциона предварительно могут ознакомиться с земельными участками, которые предлагаются для продажи на аукционе, путем выезда к месту нахождения этих участков.

Более подробная информация об аукционах, условиях участия размещена на официальном сайте Узденского районного исполнительного комитета: **www.uzda.minsk-region.by,** либо по телефонам: **(801718) 35111, 35135, 35151.**

■ Дэфіле ў андараку

«ПРЫГОЖА, ЭТНІЧНА, ПА-БЕЛАРУСКУ!»

Дызайнеры растлумачылі, што такое наш стыль і чаму нацыянальныя матывы ў трэндзе

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Беларускія традыцыі не толькі каштоўныя, але і модныя: пра гэта сведчыць тое, што ў Мінску ўжо другі раз пройдзе фестываль-конкурс беларускай моды і мастацтва «Этна Стыль». «Мы хочам падтрымліваць нашы гістарычныя карані», — сказала на прысвечанай мерапрыемству прэс-канферэнцыі «Міс Беларусь-2008» Вольга ХІЖЫНКОВА.

У конкурсе, які будзе праходзіць 21—23 красавіка ў Нацыянальнай школе прыгажосці, могуць прымаць удзел як вядомыя дызайнеры, так і пачаткоўцы. Будзе некалькі намінацый: «Майстар» (дызайнерскія калекцыі, якія пакажуць уплыў народнай культуры на сучасны касцюм), «Творчы пачын» (конкурс для маладых дызайнераў), «Этна-эксперымент» (конкурс індывідуальнага этна-вобраза), а таксама намінацыя для фатографаў «Этна-фота-арт». Пераможцы атрымаюць магчымасць прадставіць свае касцюмы на міжнародных конкурсах, у тым ліку на «Міс Свету».

Арганізатары ўжо атрымалі больш за два дзясяткі заявак ад дызайнераў, сярод іх, апроч айчынных, прадстаўнікі з Расіі і Украіны, паведаміла **дырэктар мадэльнага агенцтва belarusmodels.by Нацыянальнай школы прыгажосці Вольга ЗЯМСКОВА.** Што прапануюць сёлета творцы?

«Мой асноўны прынцып — выкарыстанне ручной вышыўкі. Тканіны, вядома, беларускія, свае (лён, бавоўна). Пляценне, аксесуары ручной работы. Усё прыгожа, этнічна, па-беларуску!» — падзялілася **дызайнер Дзіна ЛАВЕЙКІНА.**

Яе калега **Анастасія ФАЛЬКОВІЧ** шые як жаночае, так і мужчынскае, і дзіцячае адзенне і адзначае, што ўсё больш кліентаў хочуць замовіць рэчы ў нацыянальнай стылістыцы. На конкурсе ж дызайнер прадставіць калекцыю «Шляхта», у якой пакажа раскошу беларускай культуры.

На фестывалі «Этна Стыль» сваю першую маладзёжную калекцыю прадставіць і **дачка вядомага дызайнера Івана Айплатава Юлія АЙПЛАТАВА.** «Мяне вельмі ўразіла, што на гэтай невялікай тэрыторыі існуе такая разнастайнасць адзення», — выказала яна сваё захапленне беларускімі традыцыйнымі строямі.

Калекцыі журы будзе ацэньваць за арыгінальнасць трактоўкі нацыянальных матываў, адпаведнасць вобраза заяўленай намінацыі, цэласнасць, тэхналогію і арыгінальныя прыёмы дэманстрацыі касцюма.

Стыліст фестывалю Андрэй КАТЛАБАЙ зазначыў, што ў Беларусі дастаткова вольны рынак для такога кшталту імпрэз. З ім пагадзілася і **рамесніца Маргарыта АНІПЕРАВА,** якая лічыць, што пакуль у нас малавата такіх мерапрыемстваў і нашай таленавітай моладзі іх не хапае.

Падчас фестывалю 22 красавіка адбудзецца шоу-праграма, а завершыць фестываль этна-кірмаш, дзе можна будзе пазнаёміцца з дызайнерамі, набыць іх вырабы ці зрабіць заказ. Ёсць падставы думаць, што ахвотных будзе шмат: этнічныя матывы ў адзенні цяпер вельмі папулярныя, асабліва сярод моладзі. У масавага нашэння арнаментаў дзе трэба і дзе не трэба ёсць як праціўнікі, так і прыхільнікі. Для дызайнераў жа гэта спрэчнае пытанне, прызналася Анастасія Фальковіч.

«Арнамент нясе сэнсавую нагрузку. Але калі мне, як творцу, падабаецца арнамент, я яго буду выкарыстоўваць і не адмоўлюся ад сваёй ідэі, калі гэта прыгожа і людзям падабаецца. У беларускай сімволіцы амаль няма арнаментаў, якія нельга выкарыстоўваць».

Зрэшты, беларускі стыль вызначаюць не толькі арнаменты, але і сілуэты, лініі, колеры, тканіны, ды і ўвесь вобраз цалкам. І ўсё ж тыя, хто стварае для нас модныя трэнды, у адзін голас заяўляюць: «Мода мяняецца, а стыль застаецца». Заўсёды актуальнымі «аксесуарамі» для жанчыны будуць лёгкасць і натуральная прыгажосць. Але напрыканцы прафесіяналы ўсё ж падзяліліся, што ў сёлетнім вяснова-летнім сезоне модныя пастэльныя колеры і шырокія свабодныя сілуэты. Матайце на вус, прыгажуні!

Дзіяна СЕРАДЗЮК.
seradzyuk@zviazda.by

Спадніцы для мужчын і сукенкі з пантэрамі

Што прапануюць насіць айчынныя дызайнеры ў наступным сезоне

Стыльныя мамы і дочкі ў адзенні ад Вольгі БАРАБАНШЧЫКАВАЙ.

Кажуць, рэвізію цёплых рэчаў лепш адкладаць да наступнай восені. Бо калі ў душы і на дварэ вясна, рызыкуеш выкінуць што-небудзь патрэбнае для халадоў. Магчыма і так, але ацаніць свой гардэроб, каб зразумець, чаго ў ім не хапае, усё ж такі варта. Тым больш актуальныя тэндэнцыі наступнага сезона восень-зіма ўжо прадставілі на Беларускім тыдні моды. Чым натхняліся айчынныя дызайнеры і па якіх прыкметах вылічыць сапраўднага модніка, чытайце ў нашым аглядзе.

РЭТРА І ПАПЯРОВЫЯ ЛЯЛЬКІ

Пышныя спадніцы з акцэнтам на таліі, сукенкі «ў кветачкі», прычоскі з буклямі... Так выглядалі дзяўчаты 40-х гадоў мінулага стагоддзя. І такі вобраз прапануе прымерыць сённяшнім модніцам дызайнер Алена Гарэцкая. Фасоны — класічныя, дэкор — арыгінальны. Мадэльер упрыгожыла адзенне пер'ямі, камянямі, шклярусам. Знаходка для тых, у каго на працы дрэс-код, — чорны дзелавы касцюм з нашытай чырвонай кветкай маку. Стрымана, элегантна і ў той жа час ярка.

Папулярныя цяпер бялізнавыя топы і сукенкі-камбінацыі Алена Гарэцкая таксама не абмінула. Насіць іх дызайнер прапануе са строгімі жакетамі. Галоўная ж «фішка» наступнага сезона — кюлоты (укарочаныя шырокія штаны, крыху ніжэйшыя за калена). Праўда, такі фасон падыдзе далёка не ўсім. Худым і высокім жанчынам — калі ласка, астатнім лепш не эксперыментаваць з даўжынёй.

Калі зранку вам не дае спакою пытанне «Што сёння надзець?», то калекцыя Марыны Давыдавай — тое, што трэба. Там не толькі ёсць вопратка на кожны дзень — нашыўкі на рэчах нагадваюць, на які дзень тыдня менавіта. На панядзелак — паліто-бомбер у клетку, на чацвер — чорны падоўжаны жакет без рукавоў, а ў пятніцу — бэжавую куртку з каўнерыкам. Адзенне прыйдзецца даспадобы тым, хто любіў у дзяцінстве маляваць уборы для папяровых лялек: некаторыя рэчы мадэльер упрыгожыла выявамі тых самых лялек і адзення для іх.

У наступным сезоне Марына Давыдава раіць звярнуць увагу на сукенкі з моцна заніжанай таліяй і паўпразрыстыя спадніцы (апошнія лепш апранаць з доўгімі джэмперамі і жакетамі, каб не выглядаць вульгарна). І яшчэ раз нагадвае: карункі і фальбоны па-ранейшаму ў модзе.

ШЧАСЛІВЫЯ ЖАНЧЫНЫ ВЫБІРАЮЦЬ ЯРКАЕ

Які колер выбраць у наступным сезоне? Дызайнер Ірына Бойцік прапануе спыніцца на цёмна-сінім, тэракотавым і пудрава-ружовым. Любіце мяняць стылі? Тады лепш гуляйце не з колерам, а з фактурай. Патрэбны лёгкі вобраз — вазьміце аргазу, строгі і стрыманы — воўну. Ідэальныя матэрыялы для прахалоднага надвор'я — кашмір, махер, віскоза. У вадалазках з высокім горлам (якія цудоўна глядзяцца з сарафанамі і жакетамі без рукавоў), вязаных спадніцах і сукенках ніжэй за калена, якія мадэльер прадставіла на подыуме, вы дакладна не змерзнеце. Аздабляюць адзенне двайныя каўнерыкі, банты і нашыўныя кішэні.

Калекцыю для гараджанак прэзентавала Юлія Бабій. Дызайнер зрабіла стаўку на мінімалізм, рэчы прамога сілуэта і свабоднага крою. Колеры выбраны самыя што ні ёсць гарадскія — шэры і сіні. Заваёўваць мегаполіс жанчынам лепш у шырокіх штанах са «стрэлкамі», туніках і мужчынскіх кашулях. З прычоскай можна не замарачвацца: проста распусціце валасы ці запраўце іх за каўнер.

А вось тэнісістка і спявачка Вольга Барабаншчыкава, якая ўжо не першы год спрабуе сябе ў якасці дызайнера, упэўнена: шчаслівая жанчына мусіць выглядаць ярка! Хочаце расказаць навакольным, што задаволены сваім жыццём, — выбірайце чырвоны, малочны, смарагдавы, фіялетавы колеры. Або рознакаляровую палоску. Што да фасонаў, то Вольга прапануе прымерыць паліто з кароткімі рукавамі, сукенкі-футаралы, мадэлі з рукавамі-валанамі.

Вобраз ад Людмілы ТАРАКАНАВАЙ.

Фота Надзеі БУЖАН.

РЭВАЛЮЦЫЯ Ў МУЖЧЫНСКАЙ МОДЗЕ

Добрая навіна для тых, хто любіць стыль сафары — у наступным сезоне ён таксама будзе актуальным. Прынамсі, дызайнер Леор Гофман выбраў менавіта гэту тэматыку для сваёй новай восеньска-зімовай калекцыі. Асноўныя колеры — бэжавы, хакі, залаты, чорны, шэры. Класічныя сілуэты і шчыльная тэкстура верхняй вопраткі нагадваюць пра археолагаў пачатку XX стагоддзя.

Заваёўваць мегаполіс жанчынам лепш у шырокіх штанах са «стрэлкамі», туніках і мужчынскіх кашулях. З прычоскай можна не замарачвацца: проста распусціце валасы ці запраўце іх за каўнер.

— Гэта адзенне для вернай спадарожніцы герояў прыгодніцкіх фільмаў: жаноцкай і грацыёзнай, але ўсё ж дзікай і небяспечнай, як пантэра, — пракаментаваў Леор Гофман.

Пантэры, дарэчы, на подыуме таксама былі — у выглядзе вялікіх аплікацый на спадніцах і сукенках. Аматарам прынтоў спадабаюцца блузы ў малюнак з вострага лісця і пялёсткаў кветак. На гэта дызайнера натхнілі карціны Анры Русо і іншых мастакоў-прымітывістаў. Паліто мадэльер аздобіў штучным футрам: натуральнае, кажа, ужо сыходзіць з моды.

Калекцыю дапаўняюць цікавыя аўтарскія аксесуары — буйныя ўпрыгажэнні (завушніцы, брошкі, падвескі) з вобразамі жывёл і раслін з афрыканскага запаведніка і лёгкія хусткі, распісаныя ў тэхніцы батыку.

Сваё бачанне мужчынскай моды прадставіла Людміла Тараканава.

— За аснову я брала прамавугольны крой, які быў папулярны ў 1920-я гады. Абапіралася на геаметрыю і стылістыку тых часоў — супрэматызм, авангардызм і канструктывізм, — тлумачыць дызайнер.

Яе калекцыя «Рэвалюцыйная» — спроба зрабіць пераварот у мужчынскай модзе. Прадстаўнікам моцнага полу прапануюць уключыць у гардэроб... спадніцы і сукенкі-сарочкі. «Я лічу сукенку мужчынскім забытым асартыментам. Узгадайце гістарычны касцюм. Тое ж самае з сарочкамі: менавіта ў іх раней спалі мужчыны. На маю думку, гэта чыста традыцыйны варыянт. Што да спадніц, то на іх быў попыт. У мяне маладыя хлопцы часам пыталіся, ці не раблю я іх», — заўважае Людміла.

Убачыце мужчыну ў спадніцы — ведайце: перад вамі сапраўдны моднік. Тым больш калі на ім капялюш-кубанка і чырвоныя шкарпэткі. Для беларусаў, пакуль не гатовых да эксперыментаў, у калекцыі ёсць больш звыклыя касцюмы-тройкі і аб'ёмныя паліто.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.
lubneuskaya@zviazda.by

ЧЫПСЫ З ЯБЛЫКАЎ І РАСТВАРАЛЬНАЕ ПЯЧЭННЕ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Мы прыйшлі да гэтага праекта не выпадкова, а год за годам ствараліпрадукты харчавання, — заўважае **дырэктар цэнтра Зянон ЛОЎКІС.** – Сёння неабходна, каб чалавек мог атрымаць з прадукту максімальную карысць. Здароўе чалавека на 70 працэнтаў залежыць ад таго, што мы ўжываем. Атлусценне, цукровы дыябет, сардэчна-сасудзістыя, анкалагічныя і іншыя захворванні звязаны з харчаваннем. У той жа час збалансаваны, разнастайны рацыён – найлепшая прафілактыка. І

Фота БЕЛТА.

ўсе нашы падраздзяленні займаюцца такім напрамкам, як аздараўленчае, прафілактычнае харчаванне.

Трэба сказаць, што за год цэнтр прапануе 500-600 рэцэптур. Сярод іх — прадукты для цяжарных жанчын і кормячых маці, спартсменаў. У межах асобнай галіновай праграмы створаны прадукты харчавання для людзей сталага ўзросту: алеі, напоі, хлебабулачныя, мясныя і малочныя вырабы. Вельмі многа зроблена для маленькага насельніцтва, у тым ліку і для дзяцей, якія маюць пэўныя праблемы, хварэюць на цэліякію і фенілкетанурыю.

Плануецца, што ў межах новай праграмы больш увагі будзе надавацца інфармаванню насельніцтва. Прычым веды аб карысных і шкодных прадуктах будуць атрымліваць нават малыя. У школах і дзіцячых садках, на думку навукоўцаў, трэба расказваць, для чаго патрэбны пэўныя вітаміны і мінералы і якія наступствы могуць быць пры іх лішку. Знаёміць жа малых з вітамінамі можна, напрыклад, адначасова з вывучэннем алфавіта.

Карысныя прысмакі

Калі так складана змагацца з харчовымі перавагамі, чаму б не паспрабаваць пайсці іншым шляхам? Напрыклад, зрабіць любімыя дзецьмі прысмакі карыснымі. Уважліва чытайце этыкеткі, шукайце ў магазінах прадукты, узбагачаныя вітамінамі, мінеральнымі рэчывамі: магніем, фосфарам, жалезам, каліем.

Сярод распрацовак вучоных – вітамінізаваныя шакалад, цукеркі, печыва. Карамель і мармелад на ізамальце (цукразамяняльнік новага пакалення) – падыдуць нават дыябетчыкам. Бацькам ласуноў варта звярнуць увагу на мармелад з растваральнымі харчовымі валокнамі (алігафруктозай ці інулінам). Лімонна-апельсінавы мармелад – ласунак, які можна даваць хворым на цэліякію, бо ён выпускаецца з кантролем глютэну.

Для дзяцей школьнага ўзросту вучоныя напрацавалі рэцэптуры на мучныя і кандытарскія вырабы. Завяршылася распрацоўка кексаў, збалансаваных па сваім кампанентным саставе з улікам патрэб дзяцей гэтай узроставай групы.

Дзіця вас просіць набыць «снікерс» – кіньце ў спажывецкі кошык батончык-мюслі. Гэта цалкам натуральны прадукт, без цукру, на мёдзе і, як бонус, з рознымі карыснымі дабаўкамі (напрыклад, як у адной з навінак — з насеннем ільну). Для малых, якія толькі вучацца жаваць, беларускія вучоныя распрацоўвалі тэхналогіі па вытворчасці растваральнага пячэння (раней такой айчыннай прадукцыі не было, яна ўвозілася з-за мяжы).

Вялася работа нават над альтэрнатывай чыпсам. Можна згадаць пра такі прадукт, як «яблыкі «Залатыя лустачкі» – гэта фруктовыя чыпсы, калі яблык вельмі тонка нарэзаны, вымочаны ў цукровым сіропе і высушаны. Цяпер распрацоўваецца шырокая лінейка прадуктаў з дабаўленнем пюрэ тапінамбура: сухія сумесі для аладак, хлеб; вучоныя рабілі ўжо і пробную партыю бульбяных чыпсаў з дабаўленнем тапінамбура.

Дзе нарадзіўся, там і спатрэбіўся

Адна з парад, якую навукоўцы даюць спажыўцу, – набываць прадукцыю «мясцовага паходжання». Напрыклад, нашым страўнікам больш падыходзіць айчынная агародніна і садавіна, а на заморскія плады часта бывае алергія. Таму, калі выпраўіцеся па вітамінную прадукцыю, звярніце ўвагу на беларускую. Усе сокі, нектары, пюрэ робяцца з айчыннай сыравіны. У нашай краіне пры вытворчасці прадуктаў для дзяцей забаронена выкарыстанне кансервантаў, узмацняльнікаў смаку, араматызатараў, фарбавальнікаў. А вось замежныя прадукты нават для самых маленькіх спажыўцоў часам могуць быць з «сюрпрызам».

Неяк супрацоўнікі аддзела тэхналогій кансервавання заўважылі, што ўскрыты слоік з імпартным дзіцячым харчаваннем прастаяў 2 месяцы (!) пры пакаёвай тэмпературы і з ім нічога не адбылося. Вучоныя былі ўзрушаны. Хіба ёсць што жывое ў такім пюрэ? Што ў яго дабаўлялася? Ці можна такую ежу прапаноўваць немаўлятам?

– У Беларусі ў галіне дзіцячага харчавання жорсткі кантроль па паказчыкам якасці і бяспекі, – расказвае **начальнік аддзела інфармацыйнай і кадравай работы Алена КІЗЕЕВА.** – Пільна адбіраецца сыравіна, прадпрыемствы маюць для яе нарыхтоўкі свае зоны. І не трэба думаць, што дзецям можна купіць у магазіне любую вялікую ўпакоўку соку і ён будзе карысным. Дзіцячыя сокі і нектары па сваіх паказчыках адрозніваюцца ад дарослых. Для іх, напрыклад, існуюць свае патрабаванні па кіслотнасці.

Сучасным мамам не трэба ламаць галаву, як зрабіць больш разнастайным меню немаўлят. У асартыменце – фруктовыя пюрэ з вяршкамі, шматкамі, тварагом. Але мала хто ведае, што існуюць і прадукты, карысныя для прафілактыкі нервовай узбуджальнасці дзяцей. Былі праведзены клінічныя даследаванні на базе Віцебскага медуніверсітэта і ўстаноўлена, што калі дзіця ўжывае гэтыя сокі і пюрэ, у яго паляпшаецца сон, яно становіцца больш спакойным, лягчэй адаптуецца да навакольнага асяроддзя. Сакрэт тут не толькі ва ўнясенні магнію і іншых мінералаў. Карпатліва падбіраецца кампанентны састаў, сыравіна.

Цяпер распрацоўваецца шырокая лінейка прадуктаў з дабаўленнем пюрэ тапінамбура: сухія сумесі для аладак, хлеб.

Часам у спажыўцоў з'яўляюцца пытанні — чаму, напрыклад, у дзіцячы сок прыўносяцца вітаміны. Але, калі даследаванні паказваюць, што беларусы мала спажываюць свежай садавіны і агародніны, а ў прадуктах, якія праходзяць тэрмічную апрацоўку, натуральных вітамінаў захоўваецца няшмат, магчыма, такія дабаўкі – адно з рашэнняў, як змагацца з дэфіцытам карысных рэчываў.

Двайны кантроль

Не спакушайцеся надпісамі на імпартных упакоўках. Часта насамрэч у прадукце няма тых вітамінаў і мінералаў, пра якія заяўляюць замежныя вытворцы.

Пры навуковым цэнтры створаны кантрольна-выпрабавальны комплекс, у складзе якога 4 лабараторыі, больш як 150 адзінак самага сучаснага абсталявання. Гэта дазваляе праводзіць маніторынг сыравіны і прадуктаў. Прычым даследаваць тут могуць да тысячы параметраў. Правяраецца не толькі айчынная прадукцыя, але і замежная.

— Наша прадукцыя не горшая, а часта нават лепшая за імпартную. Напрыклад, у Еўрасаюзе ў першую чаргу кантралюецца сыравіна. У нас жа здзяйсняецца двайны кантроль – і сыравіны, і прадукцыі, якая з яе вырабляецца, — заўважае **начальнік Рэспубліканскага кантрольна-выпрабавальнага комплексу па якасці і бяспецы Ірына ПАЧЫЦКАЯ.**— Мы распрацоўваем методыкі, якія дазволяць з высокай дакладнасцю ўстанавіць колькасць асобных кампанентаў, ідэнтыфікаваць прадукты харчавання, выявіць выпадкі фальсіфікацыі. У імпартнай прадукцыі мы знаходзілі кансерванты, якія не былі заяўлены на этыкетцы. Гародніна, якая ўвозіцца, часам змяшчала перавышальную колькасць нітратаў. Такая прадукцыя бракуецца і ўтылізуецца.

Вучонымі праведзена вялікая праца па даследаванні маргарыну, спрэдаў і іншай маслатлушчавай прадукцыі на наяўнасць трансізамераў тлустых кіслот, якія могуць прыносіць шкоду здароўю. Сёння на этыкетках вы можыце ўбачыць інфармацыю пра колькасць гэтых рэчываў. Цяпер вучоныя распрацоўваюць методыкі па выяўленні пальмавага алею ў рознай прадукцыі.

Кантралюецца і колькасць сапанінаў. Так, пры вытворчасці халвы выкарыстоўваецца экстракт кораня салодкі, які змяшчае сапаніны – рэчывы, якія выклікаюць згусанне крыві. Бяспечныя для дарослых, сапаніны могуць засвойвацца ў далікатных страўніках дзяцей і прыносіць шкоду здароўю.

Між іншым, распрацаваныя вучонымі методыкі дазваляюць абараняць як спажыўцоў, так і вытворцаў. Напрыклад, айчынныя прадпрыемствы пры вытворчасці шакаладу выкарыстоўвалі масла какавы, а прадукцыя, што ўвозіцца, змяшчала яго эквіваленты. Недасведчаны пакупнік спакушаўся на больш танныя замежныя прысмакі. Але сёння дзякуючы наладжанаму кантролю, мы абаронены ад увозу падобнай няякаснай прадукцыі.

Уважліва чытайце надпісы на этыкетках і выбірайце найлепшае!

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

• У тэму

Салодкае жыццё

Жыхарам Беларусі трэба перагледзець свой рацыён. Як заўважыла начальнік упраўлення абароны правоў спажыўцоў і кантролю за рэкламай Міністэрства гандлю Беларусі Ірына Барышнікава, мы спажываем цукру больш за норму на 11,5 кілаграма за год. І справа тут не толькі ў любові да салодкага чаю: лішні цукар мы атрымліваем у тым ліку з кандытарскіх вырабаў, газіраваных напояў. Трэба адзначыць, што сёння вядзецца работа па кандытарскіх галінах — прадпрыемствы пераходзяць на замяняльнікі цукру новага напрамку.

На душу насельніцтва ў год прыпадае таксама лішніх 18 кг мяса, 47,9 кг бульбы, 7,6 кг алею, 41 яйка. Затое спажыванне рыбы не даходзіць да нормы на 4,2 кілаграма на чалавека ў год. Як ні дзіўна, малочных прадуктаў мы таксама недаатрымліваем, прычым на 91,5 кілаграма!

Актыўней беларусам трэба «налягаць» на садавіну і агародніну. Тым больш што недахопу ў айчыннай плодаагародніннай прадукцыі сёння няма. За апошнія дзесяць гадоў у краіне пабудавана больш за 100 гектараў цяпліц, што дазваляе атрымліваць вітамінную прадукцыю круглы год. Як паведаміла намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення раслінаводства Мінсельгаспрада Таццяна Карбановіч, штогод краіна нарошчвае экспарт. Так, летась па бульбе ён дасягнуў больш як 300 тысяч тон, па агародніне — 200 тысяч тон. Больш краіна стала вырошчваць яблыкаў, і цяпер праводзіцца маштабная праграма па закладцы новых садоў.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПЕРВЫХ И ПОВТОРНЫХ ОТКРЫТЫХ АУКЦИОНОВ ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ

Организатор аукционов: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел. (0212) 42-61-62

Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка
Лот №3. Земельный участок с кадастровым №221281205101000125, площадью 0,1405 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Врановский с/с, д. Поляи, ул. Солнечная, участок №1 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения отсутствуют. **Начальная цена**: 31 649 600 бел. руб. **Размер задатка:** 3 165 000 бел. руб.
Дата, время и место проведения повторного аукциона: 03.05.2016 в 15.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатка и приема документов:** с 18.04.2016 с 8.30 по 02.05.2016 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» в рабочие дни с 8.30 до 17.30. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с 3600314020043 в ф-ле №200 Витебского обл. управления ОАО «АСБ Беларусбанк» МФО 635, УНП 300972045, код платежа 4901, получатель платежа: Врановский сельисполком

Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка
Лот №1. Земельный участок с кадастровым №221288502601000075, площадью 0,1499 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Туловский с/с, д. Пуща, ул. 1-я Пущанская для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения на зем. участке отсутствуют. **Начальная цена:** 22 852 530 бел. руб. **Размер задатка:** 2 285 000 бел.руб. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с 3600314130148 ф-л №200 Витебского обл. управления ОАО «АСБ Беларусбанк» МФО 635, УНП 300971263, код платежа 4901, получатель платежа: Туловский сельисполком
Лот №2. Земельный участок с кадастровым №221285905601000070, площадью 0,1500 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Мазоловский с/с, д. Койтово, ул. Парковая, вблизи дома №34Б для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона рек и водоемов (р. Западная Двина). **Начальная цена:** 9 466 200 бел. руб. **Размер задатка:** 947 000 бел. руб. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с 3600314090174 в ф-ле №200 Витебского обл. управления ОАО «АСБ Беларусбанк» МФО 635, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа: Мазоловский сельисполком. Условие продажи: строительство линии электропередачи осуществляется за счет покупателя зем. участка
Дата, время и место проведения аукциона: 18.05.2016 в 16.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатков и приема документов:** с 18.04.2016 с 8.30 по 17.05.2016 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» с 8.30 до 17.30 в рабочие дни

Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка
Лот №1. Земельный участок с кадастровым №221280610101000866, площадью 0,1500 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Бабиничский с/с, аг. Ольгово, ул. Лесная для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: охранная зона электрических сетей напряжением до 1000В. **Начальная цена**: 78 102 300 бел. руб. **Размер задатка:** 7 811 000 бел. руб.
Лот №2. Земельный участок с кадастровым №221280610101000865, площадью 0,1500 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Бабиничский с/с, аг. Ольгово, ул. Полевая для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: охранная зона электрических сетей напряжением до 1000В. **Начальная цена**: 71 002 100 бел. руб. **Размер задатка:** 7 100 000 бел. руб.
Лот №3. Земельный участок с кадастровым №221280601101000253, площадью 0,1499 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Бабиничский с/с, аг. Бабиничи, ул. Луговая, 23 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: отсутствуют. **Начальная цена**: 33 779 600 бел. руб. **Размер задатка:** 3 378 000 бел. руб.
Лот №4. Земельный участок с кадастровым №221280603601000065, площадью 0,1500 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Бабиничский с/с, п. Витьба, ул. Шоссейная, 16 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения отсутствуют. **Начальная цена**: 63 376 560 бел. руб. **Размер задатка:** 6 337 656 бел. руб.
Дата, время и место проведения аукциона: 19.05.2016 в 16.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатков и приема документов:** с 18.04.2016 с 8.30 по 18.05.2016 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» с 8.30 до 17.30 в рабочие дни. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с 3600314010037 ф-л №200 Витебского обл. управления ОАО «АСБ Беларусбанк» МФО 635, УНП 300594330, код платежа 4901. Получатель платежа: Бабиничский сельский исполком. **Условия аукциона:** получить техническую документацию и разрешение на строительство жилого дома

Аукционы проводятся в порядке, установленном Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 №462. Для участия в аукционе приглашаются граждане РБ, консолидированные участники (двое и более граждан). **Для участия в аукционе** граждане РБ подают заявление об участии в аукционе, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка, заключают с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность; консолидированными участниками – оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе. При подаче документов на участие в аукционе граждане предъявляют паспорт гражданина РБ, представители граждан, уполномоченные лица (представители) – документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные в установленном законодательством порядке. **Условия аукциона: победитель аукциона, единственный участник несостоявшегося аукциона обязан:** в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за зем. участок и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения; обратиться за гос. регистрацией права на зем.участок в двухмесячный срок со дня проведения аукциона; получить тех. документацию и разрешение на строительство жилого дома; приступить к занятию зем. участка в течение 1 года со дня утверждения проектной документации (течение 1 года со дня гос. регистрации зем. участка и возникновения права на него по зем. участку в п. Витьба, ул. Шоссейная, 16); снять, сохранить и использовать плодородный слой почвы из-под габаритов здания (из-под пятен застройки) и использовать для благоустройства прилегающей территории, осуществить строительство в сроки, определенные ПСД. Инженерные коммуникации и сооружения на зем. участках отсутствуют. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией. Назначение зем. участков в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: 1 09 02 – зем. участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по гос. регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Аукцион состоится при наличии не менее 2-х участников. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра на местности земельного участка. **Конт. тел.: (0212)42-61-62, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by.**

■ Кніжны жарцік

ФЕЛІНАЛОГІЯ АД ДОКТАРА ШТЭЙНЕРА

Для загадчыка кафедры беларускай літаратуры ГДУ імя Ф. Скарыны, прафесара Івана ШТЭЙНЕРА ў Гомельскай абласной бібліятэцы знайшлі жывёлу, якая адпавядае выдатнай асобе гэтага вядомага беларускага літаратуразнаўцы, пісьменніка і драматурга. Жоўты кот са штучнага футра парадаваў доктара філалагічных навук. Актам узаемнасці стала прэзентацыя кніжкі «Кот-ваявода», напісанай адразу на беларускай, рускай і лацінскай мовах. Эразм Ратэрдамскі адпачывае.

Еўрапейскі вучоны-гуманіст, дарэчы, згаданы невыпадкова. Вялізныя цытаты са знакамітай «Пахвалы Дурасці» пачынаюць кожны з XXI раздзела кнігі Штэйнера. Менавіта так, рымскімі лічбамі. І зноў жа — наўмысна. Бо і назвы іх для чытача, дасведчанага ў латыні. А калі кругагляд толькі ў працэсе пашырэння — пераклад з тлумачэннем.

Між тым Іван Штэйнер выбраў для прэзентацыі не толькі залу, але і дзень. У першы дзень красавіка можна ўсё, у тым ліку смяяцца з сябе і сяброў. І яны разам гэта рабілі з усёй шчырасцю душы і вопыту. Аматарскі тэатральны калектыў бібліятэкі «Гракі» ў дзень, калі проста трэба жартаваць і здзекавацца адзін з аднаго, змог здзівіць і нават напалохаць прысутных. У самым пачатку відовішча сцэну доўга прыбірала «спецыяліст па клінінгу». У момант, калі абурэнне занадта сур'ёзных людзей стала даходзіць да кропкі кіпення... шыбанула ў залу вадкасць з вядра. Праўда, насамрэч яно аказалася пустым, але ж стары як свет тэатральны прыём спрацаваў. Зала была канчаткова расняволеная і падрыхтаваная да прэзентацыі сур'ёзнай кнігі несур'ёзнага прафесара філалогіі.

Яго студэнты — былыя і цяперашнія — глядзяць на выкладчыка часцей з усмешкай, чым з жахам. Кажуць, ён можа спяваць на лекцыі, можа расказаць байку са свайго жыцця і ўвогуле з ім не занудзішся. Афарызмы ён раскідае, як нядбайны пасажыр на вакзале — шалупінне семак. І ўсё ж дарэчы.

Многіх сваіх калег, у тым ліку з негуманітарных факультэтаў, ён змог «заразіць» беларускай мовай. **Доктар біялагічных навук, прафесар, дэкан біялагічнага факультэта ГДУ імя Ф. Скарыны Віктар АВЕРЫН** гаворыць, што сам быў здзіўлены, як з падачы Івана Штэйнера пачаў чытаць па-беларуску:

— У новай кнізе мне спадабалася тая філасофія, якая там ёсць. Сапраўды, дарэчы цытаты старажытных філосафаў. Яны ж дагэтуль актуальныя і адлюстроўваюць жыццё сённяшняе.

Кажуць, якія б намаганні творца не прыкладаў, жывёл і асабліва кошак усё роўна не пераплюнеш па шчырасці і непасрэднасці. Можа, таму многія аўтары ва ўсіх жанрах мастацтва і ва ўсе часы звяртаюцца да вобраза, праз які вельмі прывабна праводзіць свае асабістыя думкі. Тут і Гофман з катом Мурам, які аддае перавагу не мышам, а вытанчанай славеснасці. Тут і Пушкін, у якога вучоны кот, які налева ходзіць па залатым ланцугу, казкі расказвае. Напэўна, сваёй кошцы.

Праз гэтую хатнюю жывёлу, якая жыве ў кожным трэцім доме і прабягае праз кожны чацвёрты мастацкі твор, можна агучыць і нешта такое, што сам не адважыўся б сказаць. Вось і Іван Штэйнер, які ўпарта лічыць сябе больш навукоўцам, чым літаратарам, не пазбегнуў спакусы і ўлез у махнатую скуру ката-міліянера Максіма. Дарэчы, вусы апошняга, як і хвост, нідзе асоба не вылазяць, толькі згадваецца веліч постаці. Напрыклад, на навуковай канферэнцыі «Кот і чалавек: праблемы і перспектывы ўзаемадзеяння», дзе прымаюць удзел вучоныя з Еўропы, а таксама «Егіпта і Індыі, краін, адкуль паходзіць герой нашага сённяшняга кангрэса». Дарэчы, адной з найактуальнейшых тэм у межах канферэнцыі становіцца абарона дысертацыі «Спецыфіка афарбоўкі катоў ва ўмовах мінімальных дозаў радыяцыі».

— У дзяцінстве я вельмі любіў казку «Каток — залаты лабок», якую мне бацька расказваў, — кажа доктар філалагічных навук Іван Штэйнер. — Пра чалавека, які пайшоў у лес, пачаў секчы дрэва і сутыкнуўся з катом, які выконваў жаданні. Такі беларускі варыянт казкі пра залатую рыбку. Я ж і кніжку хацеў назваць: «Каток — залаты лабок». Але ж цяпер чытач усё можа ўспрыняць па-іншаму, у яго пры такой назве іншыя асацыяцыі ўзнікаюць. І не толькі ў гэтым выпадку. Я цяпер нават не магу студэнтам расказваць, што ў Віленскім універсітэце кожная група мела свой колер. Адам Міцкевіч і Ян Чачот былі ў блакітнай. Перастаў казаць пра гэта, бо студэнты пачынаюць гігікаць. Між тым катоў я заўсёды любіў, хоць у мяне цяпер няма ката. Бралі калісьці, але ён разумны быў — сышоў ад мяне. Вачыма звяроў можна паглядзець на жыццё чалавека ў іншым падсвятленні. Жанр вызначаны як «смяхотная штука». Там такая філасофская ідэя: сутнасць чалавека застаецца нязменнай — што сёння, што 500 гадоў таму. Я хацеў паказаць, што не мяняюцца жаданні, жарсці, мары і надзеі людзей. Дзеля іх здзяйснення чалавек адважваецца нават на якую хочаш авантуру.

Што тут дадаць? **Doctoribus atque poetis omnia licent** — Вучоным і паэтам дазволена ўсё.

Ірына АСТАШКЕВІЧ. *iost@zviazda.by*
Фота аўтара

■ Дзівакі?

НАШ КАНКУРЭНТ ДЭВІДА КАПЕРФІЛЬДА...



Беларускі ілюзіяніст Віктар Шышко ганарыцца тым, што на сёння з усіх фокуснікаў толькі ён і Каперфільд могуць «разрэзаць» чалавека на дзве часткі. Вядома, што Дэвід здзівіў свет, сярод іншага, і «знікненнем» статуі Свабоды. Віктар ведае, як зрабіць так, каб «знік», напрыклад, «БелАЗ». Былі б толькі грошы, але айчынныя тэлекампаніі пакуль не гатовы да такіх грандыёзных праектаў. Падчас размовы з артыстам журналіст «Звязды» міжволі параўноўваў яго з Воландам з «Майстра і Маргарыты». Або з Астапам Бендэрам, які ў цягніку расказваў моладзі пра выступленні з фокусамі.

НА ІЛЮЗІЯНІСТАЎ НЕ ВУЧАЦЬ

Віктар прыехаў у Віцебск напярэдадні адзінага канцэрта ў гэтым горадзе. Ён стаў вядомы на прасторы былога СССР пасля ўдзелу ў шоу «Здзіві мяне!» на расійскім тэлевізійным канале «ТБ-3». Хоць да гэтага ў яго была аўтарская 1,5-гадзінная праграма «Магія». Над падрыхтоўкай яе працаваў каля 5 гадоў. Паколькі згаданы тэлевізійны праект пераважна здымалі ў старадаўнім асабняку, Віктар пакарыў журы ў вобразе сярэднявечнага вампіра. І тэлегледачам такое спадабалася.

— На ілюзіяністаў у навучальных установах мастацкага напрамку не вучаць. Я захапіўся фокусамі гадоў у 12. Тады яшчэ не было інтэрнэту, таму вучыўся па кнігах. Жыў у Магілёве, дзе і нарадзіўся. Цяпер пераважна жыву там і ў Маскве. Дэбют у якасці фокусніка адбыўся ва ўзросце 16 гадоў на сцэне Магілёўскага каледжа мастацтваў. У 2002 годзе ў абласным цэнтры выступаў Ігар Кіа. Я здолеў не толькі «прабіцца» да яго, але і паказаць, чаму навучыўся. Ён сказаў, каб не кідаў тое, што мне так падабаецца. На жаль, больш мы не бачыліся. Я заданволены тым, што ажыццявіў сваю дзіцячую мару — рабіць ілюзійныя нумары. І займаюся гэтым, паверце, не каб зарабіць шмат, а для творчай рэалізацыі... Так, цяпер можна купіць фокусы. Іх прадаюць у спецыялізаваных крамах. І цана розная. У прыватнасці, кітайцы масава вырабляюць

абсталяванне, якое нядорага каштуе. А ўсе мае трукі створаны індывідуальна. Копій няма ў свеце, — распавядае Віктар.

ДЭВІД ЛЁТАЕ, ДЗЯКУЮЧЫ... РАСІЯНАМ

Пакуль што Віктар не сустракаўся са сваім кумірам Каперфільдам, але марыць пабачыцца з ім у Лас-Вегасе, дзе той працуе, калі не гастралюе.

— Вядома, ён заканадаўца моды ў нашым жанры, самы лепшы, — не ўтойвае захаплення беларускі чараўнік. — І тыя, хто кажуць дрэнна пра яго, проста зайздросцяць. Ён вялікі працаголік і фанатык мастацтва. Ілюзія для яго — не бізнес, а жыццё. Хоць ён можа ўжо наогул не выступаць. Дэвід — самы багаты артыст у свеце: свой востраў, самалёты... А дае 400 шоу на год!!! Славуты нумар з палётам Дэвіду абышоўся ў 700 тысяч долараў. Плюс патэнт, які ён купіў, дарэчы, у расійскай кампаніі, звязанай з космасам. Я і мая каманда не купляем патэнты, а, паўтаруся, стараемся ствараць нешта новае, эксклюзіўнае. Мы прайшлі этап капіравання, калі спрабавалі «зрабіць, як Дэвід». Стараемся, каб і ў нас на шоу людзі ўбачылі нешта чароўнае.

Каб стварыць усяго адзін нумар, ілюзіяніст і аднадумцы могуць патраціць месяцы і нават гады. Абсталяванне ствараецца па ўнікальных чарцяжах.

— Са мной працуюць спецыялісты сусветнага ўзроўню. Яны з розных краін. У першую чаргу нас звязваюць сяброўскія адносіны, а не камерцыйныя. Ілюзійны жанр — гэта сплаў розных навук і мастацтваў. Пачынаючы ад тэатра і заканчваючы фізікай і хіміяй, — расказвае артыст.

17 красавіка Віктар Шышко са сваёй камандай пакажа ў Віцебскай абласной філармоніі шоу «Спячая прыгажуня». Для гэтага яны прывезлі сюды некалькі тон дэкарацый і ілюзійнай апаратуры. Гледачы ўбачаць цуды, якія ў кіно робяць толькі пры дапамозе камп'ютарнай графікі, абяцае ілюзіяніст. Мантаж абсталявання доўжыцца прыкладна шэсць гадзін.

— Галавакружныя трукі з людзьмі, якія лятаюць, знікаюць і гэтак жа раптам з'яўляюцца. Самыя смелыя гледачы змогуць стаць удзельнікамі фокусаў на сцэне. Як і праверыць апаратуру і пераканацца ў рэальнасці таго, што адбываецца, — інтрыгуе майстар.

ЗАЙЗДРОСНЫ ХАЛАСЦЯК

Віктар чамусьці ўтойвае свой узрост. Маўляў, хай для публікі застануся вечна маладым. Неахвотна расказвае пра сям'ю. Пасля настойлівай просьбы сказаў, што бацькі — далёкія ад мастацтва людзі. Затое вельмі цёпла ўспамінае дзеда.

— Ён, нягледзячы на жыццёвыя цяжкасці, не страціў аптымізму. Шмат увагі мне заўсёды ўдзяляў. Дзед вадзіў мяне на гурткі. Першыя музычныя інструменты (а пачынаў я ў творчасці як музыкант) — яго падарункі. Ён любіў усё, што звязана з мастацтвам, працаваў вадзіцелем і вельмі любіў падарожнічаць, — дзеліцца Віктар.

Ілюзіяніст ганарыцца тым, што вучыўся з Пятром Ялфімавым. Не таму, што спявак выступаў на «Еўрабачанні» і досыць папулярны, а з-за адданасці Пятра мастацтву.

Пра планы адносна ўласнага сямейнага жыцця Віктар сказаў толькі, што пакуль увесь у творчасці. Ён увогуле адмоўна ставіцца да выстаўлення напаказ «зорных» сямейных гісторый і драм. Дзяўчат ён на сцэне... «распілоўвае» пакуль што на дзве часткі. Увосень плануе роўненька на тры. Гледачы з усіх бакоў змогуць за гэтым назіраць.

Падчас выступленняў бываюць у яго і кур'ёзы. Раней каманда артыста карысталася рацыямі. Дык аднойчы ў грымёрнай Віктар пачуў, што праграма пачалася без яго. Пабег на сцэну. Потым высветлілася, што на адной хвалі з памочнікамі Віктара быў дальнабойшчык з рацыяй. Пачуўшы пытанне: «Ну што, едзем?», вадзіцель адказаў: «Так!». Ён жа ехаў! Пасля гэтага каманда ілюзіяніста карыстаецца выключна мабільнымі тэлефонамі.

Зразумела, «чараўніка» цяжка здзівіць. Але...

— Чаму арэнда глядзельнай залы ў параўнальна малым горадзе даражэйшая, чым у Мінску — магія для мяне. Гэтага не магу зразумець. Віцебска гэта не тычыцца, — прызнаўся ён.

Наконт рэакцыі гледачоў Віктар заўважыў, што мужчыны спачатку бываюць «непрабіўныя». А дамы, можна сказаць, агрэсіўныя. Але, калі гледачы бачаць, напрыклад, фокус з трусам, які з'яўляецца ніадкуль, а потым знікае, пачынаюць рэагаваць, як дзеці...

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
pukshanski@zviazda.by
Фота аўтара і з асабістага архіва ілюзіяніста

■ На конкурс апавяданняў

Мікола Адам належыць да пакалення, якое прыйшло ў літаратуру ў сярэдзіне 90-х. З таго часу (а мінула не так і мала — дваццаць пяць гадоў, бадай, дастаткова, каб не толькі заявіць, але і сцвердзіць сябе ў прыгожым пісьменстве) ён напісаў некалькі раманаў, аповесцяў, паэм, а таксама шмат апавяданняў, вершаў, выдаў кнігі прозы ў «Мастацкай літаратуры» і ў маскоўскім выдавецтве. Адным словам, імя яго не згубілася ў літаратурных нетрах, як гэта часам бывае нават з тымі, хто пачынаў, здавалася б, вельмі голасна. З іншага боку, літаратурная творчасць — заўсёды дарога пад гару, дарога, якая з гадамі не становіцца больш лёгкай — хутчэй, наадварот. Калі, вядома, з вялікай адказнасцю ставіцца да сваёй працы, да слова. А Мікола Адам якраз з тых аўтараў, хто адчувае гэтую адказнасць.

Алесь БАДАК.

Мікола АДАМ

СПАТКАННЕ Ў АДНУ НОЧ

З Таняй Верабей Адама пазнаёміла аднакласніца летам 1996 года, калі той, скончыўшы першы курс філфака, прыехаў на вакацыі ў бацькоўскі дом пад Стоўбцамі. Гэта здарылася на турбазе «Высокі бераг», размешчанай на беразе Нёмана і абкружанай з усіх бакоў лесам.

Адам тады прастаўляўся за ўдала здадзеную сесію. Ён абяцаў аднакласніцы (іх хаты ў вёсцы глядзелі вокны ў вокны), што калі здасць іспыты без хвастоў, абавязкова адсвяткуе з ёю. Яна прывяла з сабою сяброўку, з якой разам вучылася ў хабзе ў Нясвіжы.

— Таня, — дзяўчына першая працягнула руку Адаму, калі той павітаўся з аднакласніцай і павярнуўся да яе. — Верабей, — чамусьці ўдакладніла.

Яны стаялі ў баку ад танцпляцоўкі пад старым, але велічным дубам, за пяць крокаў ад бара, калі Адам падышоў да іх. Ён паціснуў новай знаёмай руку, прапанаваў зайсці ў бар, аднак дзяўчаты заўпарціліся і папрасілі яго вынесці лепш усё на прыроду, яны ўжо і палянку прыгледзелі.

Адам падпарадкаваўся.

Яшчэ было не так цёмна, калі ён і сяброўкі ўладкаваліся пад разгалістай пухнатай сасной з партвейнам і фруктамі.

Аднакласніца прайгравала Тані. Яны вельмі розніліся. Таня была невялікага расточку, хударлявая (вось чаму назвала і прозвішча, якое пасавала ёй, як нікому, хіба яшчэ Эдзіт Піяф), з русявымі да плячэй валасамі пад бейсболкай і агромністымі блакітнымі вачыма з доўгімі вейкамі, якія здаваліся намаляванымі. Адзетая ў блакітныя, працёртыя на каленях джынсы і спартыўную жаваную кофту ў чорна-бела-ружовыя квадраты з лэйблам на грудзях «Адзідас». Аднакласніца ж на ейным фоне выглядала як гара. Шыракакосная, аднаго росту з Адамам, вугрыстай скурай, але анёльскім галаском. Танін голас чысцінёй не здзіўляў, аднак заварожваў прыемнай для слыху хрыпатцой.

Піла Таня ўмеючы і не п'янела, у адрозненне ад сяброўкі. Тая вельмі хутка наклюкалася. І тады Верабей «пайшла ў атаку» на Адама, які глянуўся ёй адразу, як яна пабачыла яго. Яна запрасіла яго на танец, якраз загучала павольная мелодыя. Аднакласніца махнула рукой, маўляў, ідзіце, танчыце і не хвалюйцеся за яе.

Яны падняліся на танцпляцоўку, выйшлі на сярэдзіну, дзе ўжо тапталася на месцы некалькі пар. Таня паклала рукі Адаму на плечы, папярэдне яго рукі апусціўшы на сваю талію. Яна ледзьве даставала яму да падбароддзя, але гэта яе нікольк не бянтэжыла, хоць праз некалькі секунд, каб здавацца крыху вышэйшай, пастала абедзвюма ножкамі на ногі хлопца і шчыльней прыхінулася да яго. У Адама закружылася галава ці то ад партвейна, ці то ад блізкасці з дзяўчынай, ці то ад пацалунка, які не прымусіў сябе чакаць. Таня, смела гледзячы ў вочы Адаму, кранулася вуснамі яго губ. Хлопец у адказ моцна сціснуў дзяўчыну ў абдымках, беручы ў палон усю яе, а не толькі рот. У той момант ён адчуваў сябе ўладаром сусвету.

— Малайчына! — Таня пахваліла Адама, як студэнта, што з паспяхова здаў іспыт, задаволена ўсміхаючыся. — Умееш цалавацца. Толькі сілу не разлічваеш, я ўсё-ткі жанчына, — нібы ўпікнула.

— Ой, прабач! — схамянуўшыся, расслабіў Адам абдымкі.

— Нічога, мне нават прыемна было спачатку. На будучыню: будзь крыху далікатнейшы.

— Як скажаш, — прамовіў Адам.

— Ніколі не згаджайся хутка, — запярэчыла раптам дзяўчына. — А лепш увогуле не згаджайся, настойвай на сваім. Нам падабаюцца рашучасць і непахіснасць.

— Ты разумная, — выдаў Адам.

— Не, разумны ты, — не пагадзілася Таня. — А я прыгожая, — засмяялася.

— Самая прыгожая! — узнёсла падхапіў Адам.

— Табе лепш відаць, — спадабалася дзяўчыне.

Адам ніколі раней і ні з кім не адчуваў такой лёгкасці ў адносінах. Таня так хутка стала для яго ўсім, што ён нават не здзівіўся гэтаму. Ён не хацеў з ёю развітвацца і не хацеў, каб музыка спынялася. Яна таксама нікуды не спяшалася. Пра аднакласніцу яны забыліся. Зрэшты, і аднакласніца, здаецца, забылася пра іх.

Прагучала апошняя мелодыя, і дзяўчына нечакана пацягнула хлопца за сабой. Яна рухалася вельмі хутка, нібыта добра ведала мясцовасць, хоць было цёмна.

— Куды мы ўсё-ткі? — вырашыў удакладніць Адам.

— Не пытайся, — спынілася Таня і пацалавала хлопца, супакойваючы. — Даверся мне, добра?

Адам згодна кіўнуў і не адставаў ад дзяўчыны.

Яны ўзабраліся на невысокі ўзгорак, дзе пад шатамі дрэў нават удзень нельга было разгледзець кампактнай драўлянай хацінкі. Таня нахілілася перад дзвярыма, замкнутымі на навясны замок, абмацала шурпатую сцяну каля іх і з нейкай шчыліны ў дошках вынула ключ. Пераможліва павярцела ім перад Адамавым носам.

Адамкнуўшы замок, увайшлі ў хату, апынуліся ў беспрасветнай цемры. Адам пачаў навобмацак шукаць выключальнік, але дзяўчына спыніла яго.

— Тут ёсць свечкі, — сказала яна. — Электрычнасці не трэба.

Тады Адам запстрыкаў запальнічкай, і пры дапамозе кволага агеньчыка ад яе Таня хутка знайшла кандэлябр з трыма свечкамі і запаліла іх. Стала больш-менш светла і ўтульна. Адам аглядзеўся. Ён трапіў у чыстую, прыбраную каморку з нізкай столлю і адным акном у лес. Злева стаяла канапа, засланая кусачай коўдрай у зялёныя і чырвоныя прамавугольнікі. Над канапай на сцяне вісеў дыванок з адлюстраваннем чорнага ката ў белай кашулі навыпуск і саламяным капелюшы, які вяртаўся праз лес з рыбалкі: на плячы нёс доўгую веду, а ў руцэ вядро, паўнюткае рыбы. У правым куце стаялі драўляны стол і два зэдлікі. Ля акна — тэлевізар «Гарызонт» на пукатай тумбачцы, на тэлевізары — відэамагнітафон. Драўляныя паліцы над сталом трымалі відэакасеты. Падлога, голая, але памытая, рыпела. На акне — квяцістая фіранка.

Таня замкнула дзверы на зашчапку і паставіла кандэлябр на стол. Павярнулася да Адама, павольна расшпільваючы маланку кофты.

На хвілю Адам быццам ацверазеў. Што ён тут робіць? Дзяўчыну, якая прывяла яго сюды, ведае ўсяго нічога, а яна ўжо гатовая пераспаць з ім. Гэта нармальна?

— Нешта не так? — наблізілася ўшчыльную да яго Таня, да канца расшпіліўшы маланку кофты. Вызірнуў ядваб станіка і лагчынка паміж невялікіх, але пукатых грудзей.

Развагі і сумненні Адама тут жа адляцелі ў вырай, як птушыная чарада, да лепшых часоў.

— Ты хочаш мяне? — запытала Таня, тулячыся да яго, прасоўваючы рукі пад яго кашулю. — Не перашкаджай мне, — прыклала палец да яго губ. — Я сама ўсё зраблю...

Пасля яны доўга ляжалі нерухома.

— У мяне ніколі не было і больш ніколі не будзе пісьменніка, — нечакана прашаптала Таня на вуха Адаму. — Не здзіўляйся, я ведаю, што кажу. А тое, што ты станеш пісьменнікам, нават не сумнявайся. Можа, гадоў праз дваццаць пяць будуць усе цябе чытаць, маладосць успамінаць.

Раптам у дзверы моцна загрукалі, пачулася лаянка.

— Не будзем адчыняць! — спалохана, але ў той жа час цвёрда сказала Таня. Яна саскочыла з канапы, сабрала свае рэчы, адышла да стала, хутка апранулася. Думала задуць свечкі, але ўсё адно позна. Святло бачылі знадворку.

Адам таксама апрануўся, стаяў пасярод пакоя, не ведаючы, што яму рабіць і чаго чакаць.

Ад чарговага ўдару дзверы зляцелі з петляў і з грукатам пляснуліся на падлогу. У памяшканне ўварваліся чацвёра, нападпітку, але з ясным розумам. Адам адчуў сябе персанажам дрэннай п'есы пра няверную жонку, маладога палюбоўніка і тупаватага мужа.

Нязваныя госці пазіралі і на Таню, і на Адама з нянавісцю.

— Ну што, шалава, вось ты мне і трапілася! — выдыхнуў першы, што стаяў бліжэй за ўсіх да дзяўчыны. Тая нічога не адказала, толькі ўгнула галаву ў плечы.

— Словы падбірай, калі з жанчынай размаўляеш, — пацягнуў чорт Адама разявіць рот. Ён тут жа атрымаў такога ляшча пад дых і аплявуху ў сківіцу, што не ўстаяў на нагах, а падняцца ўжо не дазволілі, адфутболілі за мілую душу, ледзь паспяваў прыкрываць твар і ныркі.

Таня ўвесь час, пакуль мяцелілі Адама, не варухнулася, застаючыся на месцы, як статуя. Толькі вочы прымружвала ў бяссільнай лютасці.

— Жанчына, кажаш? — каментаваў кожны ўдар той самы першы. — На ёй пробу няма дзе ставіць. Першая шалава ў горадзе! Знікла, праўда, год таму, узнагародзіўшы мяне цікавай хваробай! Мяне, чуеш?! Я нават вачам спачатку не паверыў, як яна смела з табой танчыць навідавоку ва ўсіх! Я яе вось на гэтай самай канапе...

— Чаму ж тады ты не мяне, а яго збіваеш? — падала ўрэшце голас дзяўчына.

— Рукі аб цябе пэцкаць — сябе не паважаць! — азірнуўся да яе пакрыўджаны, і збіццё спынілася. — А яму навука будзе. Нічога, да вяселля ўсё загоіцца. І раю, — звярнуўся да Адама, — хутчэй бегчы да венеролага, пакуль не позна. Я цябе б не крануў, — дадаў на выхадзе, — калі б ты мяне не зачапіў. Усю злосць на цябе спусцілі.

Ён сплюнуў сабе пад ногі, і прыхадні сышлі.

Таня кінулася да Адама, які падымаўся з падлогі, абапіраючыся на канапу. З пабітага носа і рассечанай губы сачылася кроў. Дзяўчына дапамагла хлопцу сесці на канапу, прыклала насоўку да яго носа.

— Прабач, — правяла рукой па валасах Адама, — я не думала, што ўсё вось так скончыцца. Ты не хвалюйся, я чыстая.

— Але ён казаў праўду? — усё ж запытаў Адам, хоць адказ адназначна ведаў.

Таня апусціла вочы.

— Ты вельмі харошы, — прамовіла праз колькі секунд, узняўшы вочы на Адама. — Такі ўзнёслы, рамантычны, ветлівы. Я ніколі не была з такім. Дзякуй табе за гэта. Калі... калі ты не хочаш, каб я заставалася, я пайду...

— Куды?

Таня паціснула плячыма.

— Пойдзем разам, да мяне, — раптам прапанаваў Адам — Адну я цябе не пушчу. Я люблю цябе.

— Ты нармальны? — сумна ўсміхнулася дзяўчына. Але вочы яе засвяціліся надзеяй.

За паўгадзіны яны дайшлі да вёскі, у якой жыў Адам, дакладней, яго бацькі.

— Можа, мне лепш вярнуцца туды? — паказала на дом насупраць, у якім жыла аднакласніца хлопца, у яе дзяўчына і спынілася, да яе і прыехала.

— Як ты сабе гэта ўяўляеш? — не пагадзіўся Адам. — Ты ведаеш, колькі зараз часу? Пабудзіш усіх...

— А калі яны хвалююцца, перажываюць за мяне? Усё ж я госця.

— Думаю, яны ўжо ведаюць, з кім ты.

Адам абняў дзяўчыну.

— А твае бацькі? — марудзіла Таня. — Як ты растлумачыш маё з'яўленне ім?

— Па-першае, — чмокнуў Адам дзяўчыну ў патыліцу, — зараз яны спяць. А па-другое, раніцай разбяромся.

Адам на дыбачках правёў Таню ў свой пакой, уключыў настольную лямпу. Таня ахнула, убачыўшы мноства кніг. Увесь пакой быў застаўлены кніжнымі стэлажамі, нібы абшыты імі, як шпалерамі. Ложак і пісьмовы стол былі нібы ўстаўлены ў іх.

Хлопец разабраў пасцель, пачаў распранацца. Зморшчыўся крыху, здымаючы кашулю. На рэбрах выступілі фіялетавыя плямы ад збіцця.

— Распранайся і кладзіся спаць, — сказаў ён дзяўчыне, якая не магла адарваць вачэй ад кніг.

— Ты ўсе іх прачытаў? — запытала яна, скінуўшы адзенне і слізгануўшы пад коўдру да Адама.

— А ты як думаеш? — пытаннем на пытанне адказаў той, тулячы да сябе падатлівае дзявочае цела.

— Думаю, прачытаў, — прамовіла Таня праз секунду.

— Правільна думаеш. Спі.

— А кахацца не будзем?

— Ты ж усіх пабудзіш.

— Я ціхенька, абяцаю.

Пасля гэтай ночы Адам больш ніколі ў жыцці Таню Верабей не бачыў. Калі ён прачнуўся, яе ўжо не было. Маці сказала, што правяла дзяўчыну на аўтобус да Стоўбцаў і ні пра што яе не распытвала. Дзяўчына сама папрасіла, каб Адама не будзілі. Канечне, маці вельмі здзівілася, што з сынавага пакоя раніцай выйшла дзяўчына. Але жыццё ёсць жыццё.

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703**
Продавец	**ОАО «МИЛКАВИТА», г. Гомель, ул. Бр. Лизюковых, 1**

Предмет аукциона

Наименование	Назначение	Общая площадь	Инвентарный номер
Бытовые помещения	Здание административно-хозяйственное	58,5 кв.м	340/С-293597
Здание конторы		52,2 кв.м	340/С-293567
Склад	Здание специализир. складов, торговых баз, баз материально-технич. снабжения, хранилищ	115,9 кв.м	340/С-293569
Здание производственного корпуса	Здание специализир. для производства продуктов питания, включая напитки, и табака	267,5 кв.м	340/С-293570
Составные части и принадлежности	Забор с воротами, асфальтное покрытие 1054,6 кв.м		
Котельная	Здание специализир. коммунального хозяйства	100,2 кв.м	340/С-293568
Составные части и принадлежности	Труба дымовая (h=24 м), две емкости по 6 куб.м		
Гараж	Здание специализир. автомоб. транспорта	82,3 кв.м	340/С-293565
Кабельная линия электропередач	Две кабельные линии 0,4кВ, длина 30 м		

Месторасположение: **Гомельская обл., г. Лоев, ул. Царикова, д. 39**

Начальная цена с НДС 20% – 415 906 680 белорусских рублей (снижена на 80%)

Сведения о земельном участке: предоставлен продавцу для обслуживания зданий и сооружений молочного завода на праве постоянного пользования пл. **0,3603 га.** Ограничения (обременения) – находится в водоохранных зонах

Задаток 10% от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с №3012343260010 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, код 739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: **15** рабочих дней после проведения аукциона.

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, условия оплаты предмета аукциона, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в **газете «Звязда» от 30.01.2016**

Аукцион состоится 17.05.2016 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. **Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 13.05.2016 до 17.00** по указанному адресу. Тел.: +375 17 280-36-37; 8029-183-69-71. www.cpo.by. E-mail: auction@cpo.by

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению открытого акционерного общества «Дзержинский лен» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже следующего имущества:

№ лота	Наименование	Начальная цена, бел. руб.	Размер задатка (10%), бел. руб.
1/15	Пресс-подборщик ПРЛ-150, 1 ось, полная масса-2100 кг., 2007 г.в., красный, рег. № -б/н, машина для уборки льна, идентификационный № 671	94 842 000	9 484 000
2/16	Пресс-подборщик ПРЛ-150, 1 ось, полная масса-2100 кг., 2007 г.в., красный, рег. № -б/н, машина для уборки льна, идентификационный № 671	107 322 000	10 732 000
3/17	Пресс-подборщик ПРЛ-150, 1 ось, полная масса-2100 кг., 2008 г.в., красный, рег. № -б/н, машина для уборки льна, идентификационный № 176	94 842 000	9 484 000
4/18	Пресс-подборщик ПРЛ-150, 1 ось, полная масса-2100 кг., 2007 г.в., красный, рег. № -б/н, машина для уборки льна, идентификационный № 112	94 842 000	9 484 000
5/19	Пресс-подборщик ПРЛ-150, 1 ось, полная масса-2100 кг., 2007 г.в., красный, рег. № -б/н, машина для уборки льна, идентификационный № 806	94 842 000	9 484 000
6/20	Пресс-подборщик ПРЛ-150, 1 ось, полная масса-2100 кг., 2007 г.в., красный, рег. № -б/н, машина для уборки льна, идентификационный № 802	94 842 000	9 484 000
7/25	Автомобиль грузопассажирский «GAZ 330232», бортовой, идентификационный № (VIN) 330230C0139880 X96330232C2467212, рег.№ АК 6806-5, 2011 г.в., бензиновый двигатель, темно-красный	95 182 800	9 518 000
8/29	Автомобиль грузовой «MAZ 533603-220», бортовой, идентификационный № (VIN) Y3M53360350004073, рег. № АА 3190-5, 2005 г.в., дизельный двигатель, белый	146 691 600	14 669 000
9/37	Прицеп «МЖТ-10», бочка, инвентарный № (VIN) 090024, 2006 г.в., двухосный	37 594 800	3 759 000
10/40	Комбайн льноуборочный «ЛК-4А», инвентарный № (VIN) 090086, 2004 г.в., красный, агрегатируется с тракторами класса 14 КН, потребляемая мощность 22кВт, масса машины 1900 кг	54 597 600	5 460 000
11/41	Комбайн льноуборочный «ЛК-4А», инвентарный № (VIN) 090070, 2008 г.в., красный, агрегатируется с тракторами класса 14 КН, потребляемая мощность 22кВт, масса машины 1900 кг	84 626 400	8 463 000
12/47	Пресс-подборщик ПРЛ-150, 1 ось, идентификационный № 806, 2007 г.в., красный, б/н., полная масса – 2100 кг	94 842 000	9 484 000
13/48	Пресс-подборщик ПРЛ-150, 1 ось, идентификационный № 176, 2008 г.в., красный, б/н., полная масса – 2100 кг	69 330 000	6 933 000
14/50	Агрегат мяльно-трепальный МТА-2Л», 2010 г.в.	986 716 800	98 672 000
15/53	Трактор «Беларус-3022ДЦ.1», 2 оси, заводской № 30200631, шестицилиндровый дизельный двигатель с рабочим объемом 7146 куб.см, мощность – 303 л.с., рег. № ОВ 3327, 2008 г.в., красный	724 428 000	72 443 000

Имущество расположено по адресу: **Минская область, г. Дзержинск, ул. 2-я Ленинская, 85.**

Аукцион по продаже лотов **1/15, 2/16, 3/17, 4/18, 5/19, 6/20, 7/25, 8/29, 9/37, 10/40, 11/41, 12/47, 13/48, 14/50, 15/53** состоится **26.04.2016** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **25.04.2016** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

№ лота	Наименование	Начальная цена с НДС, бел. руб.	Размер задатка (10%), бел. руб.
1	размотчик рулонов льна РЛ, инвентарный № 090014, производительность до 1250 кг/ч, габаритные размеры 3050*1500*2090 мм, масса – 1200 кг, мощность 3,55 кВт.	27 288 000	2 728 800
2	зерносушилка карусельная универсальная СКУ-10, инвернтарный № 090037.	165 120 000	16 512 000
3	машина мяльная М 110Л, инвентарный № 090040, установленная мощность – 11кВт., габаритные размеры 2150*1845*1380 мм, масса – 3515 кг.	45 996 000	4 599 000
